ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Аўторак 22 лютага 1938 г., № 10 (352). Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

Гераічная армія совецкага народа

Слаўнай, непераможнай Чырвонай Арміі дваццаць год. Юбілей Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота з'яўляецца велізарнейшым святам усіх народаў Краіны Советаў.

Створаная ў агні грамадзянскай вайны, выхаваная партыяй Леніна — Сталіна, Чырвоная Армія 20 год абараняе рубяжы першай у свеце социялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

З першых-жа дзён Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі на маладую Совецкую рэспубліку накінулася белагвардзейскае груганнё. Яму пачалі дапамагаць імперыялісцкія драпежнікі. Ламаючы супраціўленне трацкісцка-бухарынскіх здраднікаў, партыя большэвікоў стварала дысцыплінаваную Чырвоную Армію, якая ў дні свайго фармавання сустрэлася з полчышчамі нямецкіх імперыялістаў.

Скарыстаўшы здрадніцтва Іуды Троцкага і яго бухарынскіх спадручных у часе мірных перагавораў у Брэсце, нямецкі імперыялісцкі драпежнік перайшоў у наступленне з мэтай знішчыць совецкую ўладу і зрабіць нашу радзіму сваёй калоніяй. Вораг захапіў Украіну і Беларусь і падыходзіў да Петраграда. Супроць інтэрвентаў узняўся рэволюцыйны народ. Маладая Чырвоная Армія гераічна змагалася з узброенай да зубоў імперыялісцкай арміяй. Паход ворага на рэволюцыйны Петраград быў адбіты.

Разбітыя ў першых баях імперыялісты і іх белагвардзейскія найміты не спыняюць сваёй спробы задушыць совецкую ўладу, каб зноў устанавіць панаванне памешчыкаў і капіталістаў. У тыя цяжкія і грозныя для краіны дні Уладзімір Ільіч Ленін пісаў: «Совецкая рэспубліка асаджана ворагам. Яна павінна быць **адзіным ваенным лагерам** не на словах, а на справе». Партыя большэвікоў і совецкі ўрад прымаюць рашучыя меры для ўзмацнення Чырвонай Арміі, якая павялічваецца да трох мільёнаў чалавек. Лепшых сваіх людзей комуністычная партыя пасылае на фронт.

«У перыяд 1918—1920 гг. таварыш Сталін з'яўляўся, бадай, адзіным чалавекам, якога Цэнтральны Камітэт кідаў з аднаго баявога фронта на другі, выбіраючы найбольш небяспечныя, найбольш страшныя для рэволюцыі месцы». Так пісаў таварыш Варашылаў аб геніяльным стратэгу рэволюцыі, аб таварышу **Сталіне**. Варашылаў, Фрунзе, Орджанікідзе, Куйбышаў, Кіраў былі на франтах, прымалі непасрэдны ўдзел у баях, у разгроме імперыялісцкіх полчышчаў.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна Чырвоная Армія рабочых і сялян маладой рэспублікі разграміла тры паходы Антанты, у якіх удзельнічала 14 імперыялістычных дзяржаў, разбіла Калчака і Юдзеніча, Дзенікіна і Врангеля, японцаў і белапалякаў.

Чырвоная Армія перамагла. Аб сваім непераможным багатыру, аб легендарных героях грамадзянскай вайны — Варашылаве, Фрунзе, Будзённым, Блюхеру, Чапаеве, Лазо, Шчорсе вызвалены совецкі народ складае песні, эпапеі, быліны.

Беларускія загоны,
Не забудуцца яны,
Як ад конніцы чырвонай
Беглі польскія паны.

Аб луганскім слёсары Кліме Варашылаве ў Лагойскім раёне складзена быліна, у якой сталёвы багатыр пролетарыята славіцца вышэй і магутней усіх вядомых народу да гэтага часу багатыроў:

Гэтак біў паноў багатыр стальны,
Выгнаў ворага з края роднага
І не біўся так Ілья Мурамец,
А ні князь Алег, як наш воін Клім.

Совецкі народ, успамінаючы баявы гераічны шлях Чырвонай Арміі, ні на хвіліну не забывае аб пагрозе новай вайны і таму яшчэ больш умацоўвае сваю армію.

У жалобныя дні смерці Леніна ў прамове на II з'ездзе Советаў таварыш Сталін, даючы свяшчэнную клятву вернасці ленінскім заветам, гаварыў:

«Ленін не раз указваў нам, што ўмацаванне Чырвонай Арміі і паляпшэнне яе становішча з'яўляецца адной з важнейшых задач нашай партыі... Паклянемся-ж, таварышы, што мы не пашкадуем сіл для таго, каб умацаваць нашу Чырвоную Армію, наш Чырвоны Флот».

Гэта клятва свята выпаўняецца. Сталінскія пяцігодкі ўзброілі нашу армію першакласнай тэхнікай. Дзякуючы няўхільным клопатам таварыша Сталіна і першага маршала Совецкага Саюза наркома абароны таварыша Варашылава ўмацоўваецца баявая і палітычная магутнасць Чырвонай Арміі і Марскога Флота. Перамога соцыялізма ў СССР, адзінства совецкага народа, аб'яднанага пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі, забяспечылі сілу і несакрушальную магутнасць Чырвонай Арміі.

Тройчы прэзрэнным трацкісцка-бухарынскім агентам фашызма, шпіёнам і дыверсантам не ўдалося падарваць магутнасці Чырвонай Арміі. Слізкія мерзкія гады выкрыты слаўнай совецкай разведкай пад кіраўніцтвам сталінскага наркома Нікалая Іванавіча Ежова.

Ні на адну хвіліну наша ленінска-сталінская партыя і ўрад, увесь совецкі народ не забываюцца аб тым, што вораг рыхтуе новую вайну супроць Совецкага Саюза. Фашысцкія грамілы ліхаманкава ўзбройваюцца. Полымя новай вайны ахапіла Іспанію і Кітай. Фашысцкія арміі Італіі, Германіі і Японіі рабуюць сцякаючыя крывёю іспанскі і кітайскі народы, спрабуюць свае сілы і падрыхтоўваюць дзікі раз'юшаны напад на краіну пераможнага соцыялізма.

Таварыш Сталін у пісьме тав. Іванову 12 лютага 1938 года пісаў:

«На самой справе, было-б смешна і глупа закрываць вочы на факт капіталістычнага абкружэння і думаць, што нашы ўнешнія ворагі, напрыклад, фашысты не паспрабуюць пры выпадку зрабіць на СССР ваенны напад. Так могуць думаць толькі сляпыя бахвалы, альбо скрытыя ворагі, якія жадаюць усыпіць народ».

Гераічныя подвігі Чырвонай Арміі натхнялі совецкіх пісьменнікаў, мастакоў і кампазітараў на стварэнне выдатнейшых твораў. «Жалезны паток» Серафімовіча, «Чапаеў» Фурманава, «Як гартавалася сталь» Н. Астроўскага, «Хлеб» А. Талстога ўвойдуць у фонд сусветнай літаратуры.

З радоў Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота выходзяць слаўныя героі Совецкага Саюза. Тысячы талентаў выпеставала Чырвоная Армія ў сваіх радах.

Беларуская совецкая літаратура ўзбагацілася новымі творамі аб Чырвонай Арміі. Гэта — «Дрыгва» Якуба Коласа, «Дванаццаць песень», вершы Янкі Купалы і інш.

Любяць і пестуюць сваю Чырвоную Армію народы совецкай краіны. У Вярхоўны Совет з яе радоў многія выбраны дэпутатамі ўсяго народа.

Пагранічная Совецкая Беларусь — фарпост на заходніх рубяжах — паслала ў Вярхоўны Совет вернага саратніка Сталіна, любімага маршала Совецкага Саюза — Клімента Ефрэмавіча Варашылава.

Днямі совецкія ледаколы «Таймыр» і «Мурман» знялі са льдзіны гераічную чацвёрку совецкіх вучоных, якія ў бязмежным моры Арктыкі вялі навуковую работу. І слаўныя лётчыкі, высадзіўшыя герояў на Паўночным полюсе, і адважныя маракі, зняўшыя герояў са льдзіны ў Грэнландскім моры, і самі героі-папанінцы паказалі ўсяму свету бясстрашнасць і адвагу совецкага народа. Дзевяцімесячны рэйс у 2 з паловай тысячы кілометраў увойдзе ў гісторыю ўсяго свету, як слаўнае сведчанне велізарнейшай адвагі і мужнасці совецкіх людзей.

Няхай запомняць фашысцкія грамілы, што непараўнаўча большы гераізм праявіць совецкі народ, калі хто паспрабуе пасягнуць на нашу свяшчэнную зямлю.

Тав. Варашылаў на парадзе ў Маскве ў дзень 20-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі заявіў, што: «Наша армія існуе не для нападу, але толькі да моманту нападу ворага на нашу радзіму. Яна будзе самай нападаючай з усіх калі-небудзь нападаючых армій, калі вораг яе прымусіць да гэтага».

Чырвоная Армія гатова сустрэць і перамагчы ворага. Гэтаму зарукай яе дваццацігадовая гісторыя, слаўная гісторыя першай у свеце арміі рабочых і сялян, першай інтэрнацыянальнай арміі.

Няхай на страх ворагам, на радасць працоўным усяго свету жыве і мацнее непераможная Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот!

Няхай жыве першы маршал Совецкага Саюза нарком абароны таварыш Варашылаў!

Няхай жыве геніяльны стратэг рэволюцыі, мудры і любімы правадыр і друг працоўных усяго свету—Сталін!

ЛЕНІН АБ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

«Без узброенай абароны соцыялістычнай рэспублікі мы існаваць не маглі. Пануючы клас ніколі не аддасць сваёй улады класу прыгнечанаму. Але апошні павінен давесці на справе, што ён не толькі здольны нізвергнуць эксплаататараў, але і арганізавацца для самаабароны, паставіць на карту ўсё... Пролетарыят, калі ён толькі хоча і будзе панаваць, павінен давесці гэта і сваёй ваеннай арганізацыяй»...

(ЛЕНІН, том XXIV, стар. 121—122).

«Мы вырашылі мець армію ў адзін мільён чалавек да вясны, нам патрэбна цяпер армія ў тры мільёны чалавек. Мы можам яе мець. І мы будзем яе мець».

(ЛЕНІН, том XXIII, стар. 217).

«Мы жывем не толькі ў дзяржаве, але і ў **сістэме дзяржаў**, і існаванне Совецкай рэспублікі побач з імперыялістычнымі дзяржавамі працяглы час нямысліма. Урэшце альбо адно, альбо другое пераможа. А пакуль гэты канец наступіць, рад самых жахлівых сутычак паміж Совецкай рэспублікай і буржуазнымі дзяржавамі немінучы. Гэта значыць, што пануючы клас, пролетарыят, калі толькі ён хоча і будзе панаваць, павінен давесці гэта і сваёй ваеннай арганізацыяй».

(ЛЕНІН, том XXIV, стар. 122).

«Совецкая рэспубліка асаджана ворагам. Яна павінна быць **адзіным ваенным лагерам** не на словах, а на справе».

(ЛЕНІН. — Усе на барацьбу з Дзенікіным. Пісьмо ЦК РКП(б) к арганізацыям партыі. «Правда» № 21, 21 студзеня 1933 г.).

СТАЛІН АБ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

«Партыя ганарыцца, што ёй удалося стварыць з дапамогай рабочых і сялян першую ў свеце Чырвоную Армію, якая ў найвялікшых баях адстойвала і адстаяла свабоду рабочых і сялян.

Партыя ганарыцца, што Чырвонай Арміі ўдалося з гонарам прайсці цяжкі шлях найжорсткіх баёў з унутранымі і ўнешнімі ворагамі рабочага класа і сялянства нашай краіны, што ёй удалося аформіцца ў найвялікшую баявую рэволюцыйную сілу на страх ворагам рабочага класа, на радасць усім прыгнечаным і падняволеным».

(І. СТАЛІН. — Аб трох асаблівасцях Чырвонай Арміі. Ваенвыдат, 1933 г., стар 3).

«З краіны слабай і непадрыхтаванай да абароны Совецкі Саюз ператварыўся ў краіну магутную ў сэнсе абараназдольнасці, у краіну, гатовую да ўсякіх выпадковасцей, у краіну, здольную вырабляць у масавым маштабе ўсе сучасныя прылады абароны і забяспечыць імі сваю армію ў выпадку нападу звонку».

(СТАЛІН. — «Пытанні ленінізма», X выд., стар. 490).

ВАРАШЫЛАЎ АБ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

«Мы цвёрда ўпэўнены, што калі ўсю гэту тэхніку прыдзецца памножыць на выдатныя кадры, якія мы маем у радах Чырвонай Арміі, на наш большэвіцкі, рабоча-сялянскі камандны састаў, на цудоўных нашых байцоў, на нашых слаўных пехацінцаў, кавалерыстаў, артылерыстаў, танкістаў, інжынераў, лётчыкаў, маракоў, на ўсю магутнасць і большэвіцкую ўпартасць пролетарыята і калгаснікаў вялікай краіны, якая жадае пабудаваць соцыялізм, — то атрымаецца такая сіла, супроць якой не ўстаіць ніякая інтэрвенцыя».

(ВАРАШЫЛАЎ. — Артыкулы і прамовы. Партвыдат, 1936 г. стар. 541).



В. І. Ленін, І. В. Сталін і Л. М. Кагановіч на Усерасійскай канферэнцыі франтавых і тылавых ваенных арганізацый. Малюнак мастака П. Васільева.
Рэпрадукцыя Саюзфота.

Слава героям—мужным сынам соцыялістычнай радзімы

Папаніну, Шыршову, Крэнкелю, Фёдараву

Віншуем вас з паспяховым выкананнем адказнага задання.

Уся наша краіна ганарыцца вашай гераічнай работай.

Чакаем вашага звароту ў Маскву.

Братняе прывітанне!

І. СТАЛІН,	А. АНДРЭЕЎ,
В. МОЛАТАЎ,	С. КАСІОР,
К. ВАРАШЫЛАЎ,	А. ЖДАНАЎ,
Л. КАГАНОВІЧ,	Н. ЕЖОЎ,
М. КАЛІНІН,	Г. ПЕТРОЎСКІ,
А. МІКАЯН,	Р. ЭЙХЕ,
В. ЧУБАР,	Н. ХРУШЧОЎ,

Остальцэву, Барсукову, Катцову

камандам „Таймыра“ і „Мурмана“

Прыміце нашу ўдзячнасць і ўдзячнасць усяго совецкага народа за бліскучае выкананне задачы па аказанню дапамогі слаўнай экспедыцыі Папаніна.

Ганарымся вашай адважнай і самаадданай работай.

Братняе прывітанне!

І. СТАЛІН,	А. АНДРЭЕЎ,
В. МОЛАТАЎ,	С. КАСІОР,
К. ВАРАШЫЛАЎ,	А. ЖДАНАЎ,
Л. КАГАНОВІЧ,	Н. ЕЖОЎ,
М. КАЛІНІН,	Г. ПЕТРОЎСКІ,
А. МІКАЯН,	Р. ЭЙХЕ,
В. ЧУБАР,	Н. ХРУШЧОЎ,

Мікола Хведаровіч

ПАПАНІНЦАМ

Адвага героя-народа
Бясстрашных на поўнач вяла.
Плылі самалёты горда,
Пурга над ільдамі мяла.

Радзімы сыны асвятлялі
Прасторы суровай начы,
І маці руку адчувалі
Яны на сваім плячы.

Паўночныя ветры снягамі
Закрылі халодны прастор.
Але зіхацела над льдамі
Зіянне Крэмлёўскіх зор.

Палярная лютая сцюжа
Крышыла таросісты лёд,
Вяла вас нязломная мужнасць,
Натхняў вас совецкі народ.

Імклівыя радыёхвалі
Да сэрца радзімы плылі.
Мы голас сяброў адчувалі
Па ўсёй неабсяжнай зямлі.

Яны-ж адчувалі ў бязмежжы
Дыханне радзімы свае
І як на Крэмлёўскай вежы
Гадзіннік дванаццаць б'е.

І вось, пасля доўгай разлукі
Папанінцы на караблі...
Ім цісвуць палярныя рукі
Народы совецкай зямлі...

Яны пакарылі прыроду,
Праславіўшы нас на сусвет...
Абранцы тытана-народа
У самы Вышэйшы Совет.

Мы стрэнем, як маці, іх шчыра,
Мы любасцю іх ахінем.
І як маракі з «Таймыра»
Мы іх на руках панясем

Праз гулкую песеннасць вуліц,
Да слаўных крэмлёўскіх варот;
Сардэчным цяплом іх атуліць
Вялікі совецкі народ.

20.II. 1938 г.

РАПАРТ ГЕРАІЧНЫХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ

ТАВАРЫШАМ СТАЛІНУ, МОЛАТАВУ, ВАРАШЫЛАВУ, КАГАНОВІЧУ Л. М., КАЛІНІНУ, МІКАЯНУ, ЧУБАРУ, АНДРЭЕВУ, КАСІОРУ, ЖДАНАВУ, ЕЖОВУ.


ЛЕДАКОЛ «ЕРМАК» — ШМІДТУ.

Бязмежна шчаслівы рапартаваць аб выкананні даручанага нам задання. Ад Паўночнага полюса да 75-га градуса паўночнай шыраты мы правялі поўнасцю ўсе намечаныя даследванні і сабралі каштоўны навуковы матэрыял па вывучэнню дрэйфу ільду, гідралогіі і метэаралогіі, зрабілі шматлікія гравітацыйныя і магнітныя вымярэнні, выканалі біялагічныя даследванні. З 1 лютага, калі на 74 градусе наша поле разламалася на часткі, мы прадаўжалі ўсе магчымыя ў гэтых умовах назіранні. Упэўнена працавалі, ні мінуты не трывожыліся за свой лёс, ведалі, што наша магутная радзіма, пасылаючы сваіх сыноў, ніколі іх не пакіне. Гарачыя клопаты і ўвага да нас партыі, урада, дарагога таварыша Сталіна і ўсяго совецкага народа безупынна падтрымлівалі нас і забяспечылі паспяховае правядзенне ўсёй работы. У гэту гадзіну мы пакідаем крыгу на каардынатах 70 градусаў 54 мінуты нордавай, 19 градусаў 48 мінут веставай, прайшоўшы за 274 суткі дрэйфу звыш 2.500 кілометраў. Наша радыёстанцыя першая паведаміла вестку аб заваяванні Паўночнага полюса, забяспечыла надзейную сувязь з радзімай і гэтай тэлеграмай канчае сваю работу.


Чырвоны сцяг нашай краіны прадаўжае развявацца над лёдавымі прасторамі.

ПАПАНІН, КРЭНКЕЛЬ, ШЫРШОЎ, ФЕДАРАЎ.


«Паўночны полюс», 15 гадзін 55 мінут.




І. Д. ПАПАНІН.



П. П. ШЫРШОЎ.



Э. Т. КРЭНКЕЛЬ.



Е. К. ФЕДАРАЎ.

Аб скліканні VIII сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Беларускай ССР

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР **пастанаўляе:**

Склікаць VIII Сесію Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР XI склікання 26 лютага 1938 года ў гор. Менску з парадкам дня:

Зацверджанне «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР».

Вык. аб. старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
Н. НАТАЛЕВІЧ.

Вык. аб. старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЕРМАК.

20 лютага 1938 г. гор. Менск.

Янка КУПАЛА

ВЕРШЫ

Арміі Чырвонай і яе палкаводцу—нашаму дэпутату Кліму Варашылаву прысвячаю

I.

Ты паслухай, наш маршал,
Аб мінулых нягодах,
Аб раз'юшаных маршах,
Аб крывавых паходах.

Жудка стане на сэрцы,
Калі ўспомніш сягоння,
Як цары-самадзержцы
Людзей гналі на бойню.

Як Вільгельма салдаты
І панят легіёны
Руйнавалі нам хаты,
Спусташалі загоны.

Наш народ катавалі
Вешалі, калолі.
Ой, каб гэтай навале
Не паўстаці ніколі.

Заглушаў посвіст куляў
Салавейкаву славу,
Кукавала зязюля,
Не к дабру кукавала.

Пакідаў гняздо бусел,
Свае пожні і сосны, —
Паляцеў, не вярнуўся
У тыя чорныя вёсны.

Там было нам нялёгка,
Дарагі Варашылаў,
У той час недалёкі,
Час крыжоў і магілаў.

Беларусь пад панамі,
Пад жандарам і царам
Палівала слязамі
І крывёю папары.

2.

Ой, гула завіруха
Гулам-шумам,
Ты падумай, брат, толькі,
Ты падумай.

Гэткае ты не знойдзеш
Век часіны
Ні ў тых казках-баладах,
Ні ў былінах.

Кроў, брат, наша лілася,
Мглою вісла,
Над Амурам далёкім,
І над Віслай.

След губляла кроў наша
У моры Чорным,
У Белым моры губляла
Непакорна.

Адусюль налягалі,
Скарпіякі
І смакталі кроў нашу,
Як вужакі.

Генералаў і князяў,
Як той гразі,
І паноў і панятаў,
Як шчанятаў...

І, здавалася, згасла
У небе сонца.
Англічане, германцы,
Ды японцы.

І мячамі Пілсудскі
То-ж ляскоча, —
Ен ад мора да мора
Польшчы хоча.

Не было канца-меры
Ліхам, бедам,
Кастыляў, як здань тая,
Голад следам.

Ой, гула завіруха
Грозным шумам, —
Ты падумай, брат, толькі
Ты падумай.

3.

Загудзелі гулка трубы,
Паўсталі народы,
Пайшлі Арміі Чырвонай
Слаўныя паходы.

Біла наша войска злыдняў
Днём і ноччу ўдала —
Акупантаў, інтэрвентаў,
Князяў, генералаў.

І ўцякалі, дзе папала,
Са страхам вялікім
Скарападскі і Петлюра,
Калчак і Дзенікін.

І паны ўцякалі жвава
Да сваёй Варшавы,
Збаляваўшы ў Беларусі
Свой банкет крывавы.

Ідзе армія з паходу
Пад сцягам чырвоным,
Шляхі сонца асвятляе,
Кветкі б'юць паклоны.
Ідзе войска, сцягі ўюцца,
Кроў бурліцца ў жылах,
А наперадзе ўсіх едзе
Сам Клім Варашылаў.

4.

Як ішлі ў паходы
Нашыя ваякі,
Сум стаяў у полі,
Бор зялёны плакаў.

Кроў лілася рэчкай
Арміі Чырвонай
Па дарогах-сцежках,
Па глухіх загонах.

Пелі кулямёты
І гарматы пелі.
Не адзін ваяка
У вечнай спіць пасцелі.

•

Як змаглі ваякі
Ворагаў праклятых,
Пасыпалі кветкі
Дзеці і дзяўчаты.

Пасыпалі кветкі,
Дзе ішлі малойцы,
А на ясным небе
Цешылася сонца.

Сам таварыш Ленін
Спатыкаў ваякаў,
Большэвіцкім словам
Казаў войску—дзякуй.

5.

Прагрымела слава
Блізка і далёка
Ад муроў Варшавы
Да Владзівастока.

Слава прагрымела,
Жыве далей слава
Нашай долі, волі
У сонечных праягах.

Абымае сонца
Маладыя ўсходы,
Не марнуюць люду
Буры-непагоды.

Пад кнутом не гнёмся,
З малку да магілы,
Не дратуе поля
Варожая сіла.

Капыты не топчуць
Як таптали здаўна,
Вясны ў кветках нашай,
Восені ўраджайнай.

Пячом караваі
З пшанічнага цеста
І спяваем песні
Сталінскага зместу.

6.

Каваль быў луганскі,
А сталь ён каваў,
І песні-веснянкі
Пра волю спяваў.
І слухалі песню
Загоны і бор,
Імчаў яе вецер,
Адносіў віхор.

Іскрыліся ў горне
Агніста вуглі,
А іскры далёка
Ляцець не маглі.

Біў молат магутна,
Як гора, як гнеў,
Кавадла звінела
І молат звінеў.

І кузня звінела,
Аж рэха йшло ў даль...
І выкаваў волю,
Як іскру, як сталь.



«Будзённы на чале чырвонай конніцы». Карціна мастака Воўчэнка (Кіеў). Рэпрадукцыя Саюзфота.

Якуб КОЛАС

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ

У бітвах, у громах навалы і бур
Узводзілі Ленін і Сталін той мур,

Што сталі мацней і цвярдзей за алмаз,
Што Арміяй горда завецца у нас.

Чырвоная Армія гэта — скала,
Адвага герояў і зоркасць арла,

Ахова свабоды, яе меч і шчыт.
Чырвоная Армія гэта — граніт.

Жалезная воля і сіла зямлі,
Дзе новае сонца і зоры ўзышлі.

Чырвоная Армія — грозны народ,
Чырвоная Армія — мужнасці ўзлёт,

Што ўзносіць у высі, якіх не знаў свет;
Чырвоная Армія — лепшы наш цвет

Вялікага сэрца гарачая кроў
І наша бязмежная гордасць, любоў.

Чырвоная Армія — наша краса,
Для ворагаў Армія наша — граза.

Жывіце-ж, красуйцеся, сокалы, львы!
Вышэй узвівайся, наш сцяг баявы!

КАЛЫМАГА ВАЙНЫ

Ад сталіцы да сталіцы
З края ў край
Ходзяць чуткі-навальніцы
Зноў чакай.

Бляск пагульвае крывавы
У пушчы хмар,
Голад скаліцца кастлявы:
Дай афяр!

План складаюць злыя сілы
Патайны.
Лічыць труны і магілы
Здань вайны.

На Советы зрок пражоры
Косіць звер —
Майстар «расавых тэорый»,
Фюрэр гер.

Злыган з ім і Мусаліні,
Самурай
На чужыя кваняць скрыні,
Дык зважай!

Кроў людская землі росіць
Трох краін!
Пан Бек стаўся «шворнам восі
Рым — Берлін».

Тарахціць вайны павозка
Скрыпам злым,
Аж з-пад «шворна і падоска»
Ідзе дым.

Ды няхай на лбе запішуць
Ездакі:
Зломяць голаў, зубы скрышаць
Бандзюкі.

Разляцяцца ў прах іх спіцы
У пуці.
Ім совецкае граніцы
Не прайсці!

12 лютага, 1938.



Пятрусь БРОЎКА

ШЧОРС

Пад сцягам радасным, чырвоным
Трывожнаю парой,
Мікола Шчорс вядзе калоны
Багунскія на бой.
«Чакайце, ворагі, сустрэчы,
Вам Кіеў не забраць!»
Далі мы клятву пад Унечай,
Не страшна паміраць.
Міколу Шчорса ўсе пазналі
Па саблях і клінках,
Не раз германцы уцякалі
Пад Злынкай у лясах.
Штыхоў навостраную ласку
Пад выбухі гранат
Адведаў гетман Скарападскі
І павярнуў назад.
Не быць драпежніцкім атрадам
На роднае зямлі.
Міколу Шчорсу даў парады
Сам Ленін ў Крэмлі.
І чуе Шчорс, як вораг гоніць
Да Кіева палкі.
Петлюра сунецца на поўдні,
З паўночы палякі.
Зямля нагрэтая дыміцца.
Ад сабель стэп звініць.
Ты помніш, вёска Белашыца,
Начдзіва на кані.
То ён знясілены, сухотны,
Пад градам куль імчыць,
То ён за лентай кулямётнай
З багунцамі ляжыць.
То крыкне голасна далёка,
Што чуцен слоў палёт:
— Трымай, Бажэнка, правым бокам,
На ворага ў абход.
То ён з усмешкай загаворыць:
— Качура, не здавайць.
Ты знай, Багунію тут, горад,
Мы будзем будаваць.
Над стэпам пыл вісіць клубамі,
Што коннікі нясуць,
Ужо разбітымі шляхамі
Петлюраўцы бягуць.
— Наперад, хлопцы!.. Бі штыхамі...
Начдзіў не даказаў.
Ен паў над жоўтымі пяскамі,
Як-быццам задрамаў.
Ен паў, задумлівы, суровы,
На спапялеўшы дол...
— Не стала Шчорса!.. жальбы словы
Прамчаліся вакол.
— Наперад, хлопцы! Знішчыць гада!
Для слёз цяпер не час.
Мацней прыціснулі прыклады
Вінтовак да пляча.
Дружней, багунцы! Бі атакай,
Начдзіў навечна змоўк...
І вось, разбіты гайдамакі,
Петлюра ледзь уцёк.
Адбой. І на руках герояў
Ляжыць адважны Шчорс...
. . . .
Прайшлі гады. На месцы боя
Шуміць пшаніца скрозь.
Стаяць асветленыя хаты.
Пад гоман спелых ніў
Пяюць калгасныя дзяўчаты,
Як паміраў начдзіў.
Ляці-ж ты, песня, небам сінім
Праз Корасцень на Сноўск,
Спявайце, ветры Украіны,
Як жыў Мікола Шчорс.

Мар'іна Горка, люты, 1938.

Ю. Рудзько

Аповесць пра ґераічныя дні

„ХЛЕБ (Абарона Царыцына)"—А. Талстога

Студзень 1918 года. «Петраград жыў у гэтыя студзеньскія ночы напружана, усхвалявана, злобна, шалёна»... Супроць маладой рэспублікі Советаў згуртоўваліся ўсе варожыя соцыялістычнай рэволюцыі сілы. Меншавікі і эсэры ўсімі сродкамі імкнуліся выклікаць недавер'е мас да большэвікоў. Не была скончана вайна з немцамі. Не было хлеба ў пролетарскіх цэнтрах рэспублікі, вораг адрэзаў шляхі да хлебных раёнаў краіны.

Для таго, каб рэспубліка здолела жыць, умацоўвацца, патрэбен быў мір, патрэбен быў хлеб. Гэта разумелі большэвікі на чале з вялікім Леніным, за гэта вялі яны рашучую барацьбу.

Смольны. У габінет Владзіміра Ільіча «ўвайшоў чалавек, з цёмнымі, стаячымі валасамі і моўчкі сеў каля Леніна... Ніжнія павекі яго бліщчаўшых цёмных вачэй былі прыўзняты, як у таго, хто ўглядаецца ў далеч...» Ленін і Сталін сумесна выпрацоўваюць план далейшай барацьбы, вырашаюць карэнныя пытанні рэволюцыі.

З расказа аб падзеях у гэтыя—студзеньскія — дні 1918 года пачынае Аляксей Талстой сваю аповесць. І далей суровымі, простымі фарбамі малюе ён карціну ґераічнай барацьбы нашага вялікага народа на чале з большэвіцкай партыяй супроць нямецкіх інтэрвентаў, супроць белагвардзейшчыны, супроць здраднікаў — наймітаў і пасобнікаў інтэрвентаў—трацкістаў, меншавікоў, эсэраў і іншых мярзаўцаў, супроць голаду і разрухі. І аб тым, як раслі і загартоўваліся ў барацьбе кадры рэволюцыйных байцоў, большэвіцкія кадры, расказвае аповесць.

В. І. Ленін, І. В. Сталін, К. Е. Варашылаў — правадыры большэвіцкай партыі—дзеючыя асобы аповесці. Надзвычай адказную і пачэсную задачу вырашыў Аляксей Талстой. У сваёй гістарычнай дакументальнай аповесці ён майстэрска акрэсліў вобразы вялікіх правадыроў партыі Леніна—Сталіна, з незвычайнай праўдзівасцю і прастатой паказаў адзін з найбольш драматычных і ґераічных перыядаў грамадзянскай вайны — абарону Царыцына, арганізаваную і праведзеную тав. Сталіным.

Люты 1918 года. «Троцкі парушыў дырэктыву Леніна і Сталіна, зрабіў найвялікшую здраду: совецкая Расія, не гатовая да супраціўлення, замест міру і перадышкі атрымала неадкладную вайну. Расія была аддадзена на раскрамсанне».

Здрада Троцкага ў Брэст-Літоўску паставіла маладую, неўмацаваную рэспубліку Советаў перад найвялікшай небяспекай, рэволюцыі пагражала гібель.

Немцы падступалі да Петраграда. «Трывожныя гудкі па загаду Леніна раздаліся праз дзве гадзіны пасля ўзяцця Пскова. Раўлі ўсе петраградскія фабрыкі і заводы. Збягаўшымся рабочым раздавалася зброя і патроны»... Рабочыя мабілізоўваліся на фронт.

А ў Смольным на пытанне Владзіміра Ільіча: «Паспеем? Нямецкія драгуны могуць ужо заўтра раніцой быць ля Нарвскіх варот.

Сталін адказваў тым-жа роўным, нягучным, спакойным голасам, якім вёў усе размовы:

— Я мяркую — паспеем... Раздадзена вінтовак і кулямётаў... — Ен прачытаў даведку. — Нямецкае камандванне ўжо даведаліся аб настроі рабочых... Шпіёнаў даволі... З нязначнымі сіламі немцы наўрад ці адважацца лезці зараз у Петраград». І гэты маленькі эпізод раскрывае ўменне правільна ацэньваць падзеі, прадбачыць іх, падкрэслівае вытрымку і спакой тав. Сталіна ў найцяжэйшыя моманты.

Ленін і Сталін арганізавалі абарону Петраграда, абарону рэволюцыі.

«Піцерскія рабочыя разумелі, што ўступілі ў барацьбу з магутным ворагам і вораг гэты носіць імя — **сусветны імперыялізм...** Гэта ўсведамленне непамерных задач аказвалася больш грознай зброяй, чым германскія гарматы і кулямёты».

Нямецкія інтэрвенты акупіравалі Украіну. Паўстаўшыя чэхаславакі адрэзалі цэнтр совецкай рэспублікі ад хлебнай Сібіры. Белыя банды захапілі Дон, пагражалі Паваложжу... Зноў паўстала найвялікшая небяспека. Рэволюцыі пагражаў страшны і магутны вораг — голад.

І зноў, як заўсёды ў найцяжэйшыя моманты, Ленін і Сталін разам выпрацоўваюць план перамогі. Сталін зрабіў аналіз і ацэнку становішча:

«... На сёнешні дзень Царыцын — асноўны фарпост рэволюцыі, — сказаў ён, як заўсёды, нібы ўглядаючыся ў кожнае слова».

І выслухаўшы Сталіна, Ленін зрабіў вывад:

...«Крыжовы паход» па хлеб трэба ўзначаліць... Памылка, што гэтага не было зроблена раней. Цудоўна! Цудоўна! — Ен адкінуўся ў крэсле і твар яго стаў ажыўленым, лукавым. — Вызначаецца цэнтр барацьбы — Царыцын. Цудоўна! І вось тут мы і пераможам...

Сталін усміхнуўся пад вусамі. Са стрыманым захапленнем ён глядзеў на гэтага чалавека — найвялікшага аптыміста гісторыі, які прадбачыць у самыя цяжкія хвіліны труднасцей тое новае, якое нараджаецца гэтымі труднасцямі, што можна было ўзяць як зброю — для барацьбы і перамогі...»

І барацьбу за хлеб узначаліў Сталін. Па прапанове Леніна ён быў пасланы з надзвычайнымі поўнамоцтвамі ў Царыцын для арганізацыі абароны гэтага «фарпоста рэволюцыі», забеспячэння цэнтраў рэспублікі хлебам.

Абстаноўка на франтах ускладнялася. Немцы акупіравалі Харкаў. Усё больш сціскалася варожае кальцо вакол Царыцына. Троцкі вёў здрадніцкую палітыку. Яго стаўленікі ў штабах арміі рыхтавалі контррэволюцыйнае паўстанне ў тылу, аддачу белым Царыцына.

Загартаваны ў баях луганскі атрад Варашылава з 60 эшалонамі прабіваўся, ведучы кровепралітныя баі з немцамі і шматлікімі белымі бандамі, па лініі Луганск — Царыцын. Здраднік Троцкі прапанаваў атраду згрупавацца на станцыі Ліхой. Але гэта пагражала гібеллю. І Варашылаў не выканаў ні гэтага здрадніцкага загада, ні другога — аб раззбраенні атрада.

План Варашылава: ...« Біцца зараз тут, у Мілераве, з немцамі — задача мясцовая і прыватная. Задача агульнарэволюцыйнага парадку высоўваецца ў Царыцыне... Калі белае казацтва авалодае Царыцыным, — Волга акажацца ў контррэволюцыі, уся поўнач застанецца без хлеба... Вывад зразумелы...»

...Белыя ўзарвалі пралёт маста праз Дон. Варашылаў вырашае тэрмінова будаваць новы пралёт. Матэрыял для гэтага адзіны — дрэва. Інжынер Бахвалаў супярэчыць: «Пяцьдзесят чатыры метры для драўляных пабудоў — вышыня амаль-што немагчымая... Матэрыял, скажам — драўляны брус, мае сваю граніцу супраціўлення...» «Матэрыял якраз таксама падпарадкуецца рэволюцыі» — адказаў Варашылаў.

І мост — «першы совецкі цуд» — быў пабудаван у найкарацейшы тэрмін.

Колькі драматычных баявых эпізодаў было на шляху да Царыцына! Якія цуды мужнасці і ґераізма праявілі чырвоныя байцы! І атрад дасягнуў мэты, бо яго вёў чалавек сталёвай волі, бязмежнай мужнасці, большэвіцкай загартоўкі — выдатны палкаводзец Клім Варашылаў. Ен «праз нямецкія і казацкія банды правёў у Царыцын слаўную армію, выкаваную ім у крывавых баях».

Бліскуча, з непараўнальнай выразнасцю зроблены такія хвалюючыя эпізоды, як сустрэча Варашылава з Будзённым у баю, раззбраенне анархісцкага атрада «Бура», выпадак з бранявіком Варашылава, загрузнуўшым і абкружаным белабандытамі, па-майстэрску напісаны батальныя сцэны.

Сталін — у Царыцыне. І «абарона Царыцына, якая здавалася да гэтага справай аднаго Царыцына, узнімалася на вышыню абароны ўсёй совецкай рэспублікі». Гэта абарона павінна была даць у чэрвені два мільёны пудоў хлеба Маскве і Піцеру.

«... Трэба пагалоўна, ад мала да вяліка, узяцца за зброю. Трэба працаваць так, каб ля твайго станка стаяла зараджаная вінтоўка. Пролетарыят павінен быць увесь мабілізован і ўзброен»—гаворыць Сталін рабочым. Сталін перабудоўвае тыл. Тыл дае фронту і зброю і людзей. Сталін арганізоўвае адпраўку эшалонаў з хлебам у цэнтр. Сталін цікавіцца такімі «тонкімі рэчамі», як шлях кожнай штабнай паперкі, і хутка раскрывае контррэволюцыйную змову аб здачы Царыцына белым — папярэджвае катастрофу, выкрывае заклятых ворагаў рэволюцыі — стаўленікаў Троцкага, засеўшых у Царыцынскіх штабах.

Сталін арганізоўвае і кіруе ўсёй абаронай Царыцына. Ен бывае ўсюды — і ў арсенале, і на заводах, і на фронце, і ў акопах. Сталін пры падтрыманні Владзіміра Ільіча ламае супраціўленне здрадніка Троцкага і стаўленікаў яго, арганізуе дастаўку фронту зброі, фарміруе з рабочых і партызанскіх атрадаў буйныя часці рэгулярнай Чырвонай Арміі. І ў часе гэтай напружанай дзейнасці ён не пакідае клопатаў аб усіх народах — піша Шаумяну па пытанню аб Закаўказзі, просіць дапамагчы Туркестану. І ў часе напружаных баёў не пакідае думак аб будучым. На фронце, выпадкова прасачыўшы палёт каршуна, Сталін гаворыць Варашылаву: «Калі-небудзь навучымся будаваць такія самалёты... А людзі могуць лётаць лепш, калі вызваліць іх сілы... Мы будзем лётаць лепш...».

Сталін і Варашылаў стварылі і загартавалі армію, якая разбіла полчышчы мамантаўцаў, абкружыўшых Царыцын.

«Наступленне совецкіх войск царыцынскага раёна ўвянчалася поспехам... Праціўнік разбіты на-галаву і адкінуты за Дон. Становішча трывалае. Наступленне прадоўжваецца. Нарком Сталін».

Гэтай тэлеграмай Леніну заканчваецца аповесць «Хлеб».

Аповесць паказвае ў абстаноўцы першага года грамадзянскай вайны генія рэволюцыі — вялікага Леніна.

Аповесць вырысоўвае велічны вобраз правадыра — мудрага палітычнага дзеяча, бясстрашнага ў баю і бязлітаснага да ворагаў народа, валевога арганізатара мас, звязанага ўсімі сваімі помысламі з народам, — Сталіна.

Аповесць паказвае баявыя дзеянні выдатнейшага пролетарскага палкаводца, арганізатара Чырвонай Арміі, Клімента Ефрэмавіча Варашылава, Сямёна Міхайлавіча Будзённага, знаёміць чытача з слаўнымі чырвонымі камандзірамі, арганізатарамі мас — Руднёвым, Пархоменка, Арцёмам, мужнымі байцамі Чугаем, Бакуном...

Як раслі і загартоўваліся рэволюцыйныя кадры, яскрава паказвае А. Талстой на вобразах піцерскага слесара Івана Гора і батрачкі з данской станіцы Агрыпіны Чэбрэц. Гэтыя вобразы праходзяць праз усю аповесць. Іван Гора ідзе ў атрад простым байцом. Ен змагаецца за дысцыпліну, выкрывае здрадніка-эсэра, які быў камандзірам атрада. Яго выбіраюць камандзірам. «Комуніст павінен умець камандаваць», — гаворыць ён. Агрыпіна прыгожая і мужная дзяўчына — батрачка, а потым баец шахцёрскага атрада. У апошнім эпізодзе мы бачым яе ў момант перадышкі між баямі. Яна звяртаецца да маладой дзяўчыны з агітпропа: «Можаце вы мяне навучыць грамаце ў два тыдні, ці не?.. Я магу шчасце сваё згубіць... Адзін чалавек, ён парцейны, Леніна добра ведае, Варашылава ведае... Бачу я — яму мая цемната хутка стане поперак горла. Ен ротны камандзір — гэта зразумець трэба»...

Мае аповесць асобныя недапрацаванасці: схематычна зроблены канец — няма разгорнутага паказу самой абароны Царыцына, залішняя публіцыстычнасць некаторых раздзелаў, незакончанасць развіцця вобразаў асобных персанажаў. Але гэтыя недапрацаванасці не зніжаюць высокага мастацкага ўзроўню і вялікай каштоўнасці аповесці.

Не загружана аповесць эпітэтамі, не расквечана метафарамі: стыль яе роўны — суровы і просты. Ен цалкам адпавядае велічнай тэме, якая распрацавана ў аповесці. Надзвычай удала і добра выкарыстаны гістарычныя дакументы, яны не толькі не парушаюць мастацкай тканіны твора, а толькі дапаўняюць, узбагачаюць яе.

«Хлеб» Аляксея Талстога — надзвычай каштоўны, таленавіты, яркі твор.

Гэта аповесць пра арганізацыю Чырвонай Арміі і барацьбу за хлеб, пра разгром белых полчышчаў і ролю ў гэтым правадыроў нашай партыі Леніна і Сталіна. «Хлеб» — бліскучы падарунак совецкаму чытачу да выдатнага свята — XX-гадовага юбілея Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Аркадзь Куляшоў

КАЛЯ САМАИ ГРАНІЦЫ

(УРЫВАК З ПАЭМЫ)

На кватэру да настаўніка Данілы Пятровіча ў зімовую завейную ноч прыходзяць невядомыя людзі. Настаўнік і былы яго вучань Ігнат Давера зразумелі, што гэта парушальнікі граніцы.

Вось парай ахутана хата
Дзве постаці, два кажухі...
Настаўнік глядзіць на Ігната,
Ігнат на яго:
«Чужакі»?...»

За стол па-начальніцку селі,
Падсунулі лямпу бліжэй
І просяць — з суседняй арцелі
Каня напытаць ім хутчэй.
Даніла Пятровіч сурова
Людзей сустракае чужых.
— Адкуль вы? Куды вы? І хто вы?
Асобай цікавіцца іх.
Дзьме холад сухі, папяровы
З партфеляў старых, скураных;
Снег тае ў старонках законаў,
Размякла балансу графа...
І сведчаць пячаці раёна:
Па часці зямельнай—Сямёнаў,
Па часці грашовай — Сафонаў,
Інструктар Райза і Райфа.
Настаўнік начальству такому
Спяшае патрапіць у тон:
— Вы, мусіць, са схода?
— Вядома...
— А ехаць далёка?
— У раён.

За вокнамі сціхла завея.
Ігнат апранае кажух,
Начальства — ён сам разумее —
Ягоных чакае паслуг.
Хіба я маленькі? Сляпы я?..
На сходзе — гавораць—былі:
Няйначай, дзяды ім сівыя
У партфелі — мяхі скураныя
Барадамі снег намялі.
Начальства з дарогі. Змаглося...
Зазнала цяжкі яно шлях:
Паўзло ад мяжы па снягах...
І, пэўна, яму давялося
Партфелі трымаць у зубах.
— Схадзі за падводай, Ігнат,
Гаворыць хлапцу гаспадар.

Давера выходзіць. У хаце
Гасцінна шуміць самавар.
Пры хатнім сядзяць самавары
Інструктар Райфа і Райза,
На светлыя іх акуляры
Ад пары кладзецца раса.
Са шклянак паны-ягамосьці
П'юць чай пасля цяжкіх прыгод.
І ўдзячна ўсміхаюцца госці:
«Даверлівы рускі народ».
Пра іх гаспадар з весялосці
Падумаў: «Зіма за вакном...
Хай, нечага, кволыя косці
Мужыцкім прапараць чайком.
Іх справа, відаць, заняпала...
Заходніх дарог махляры
Сваіх самазванцаў, бывала,
Маскве падсылалі ў цары.
А сёння праз нашы кардоны
Ахранак надзея й краса —
Паўзе самазванец раённы —
Інструктар Райфа і Райза.
Збяднела суседка-дзяржава
(Здрабнеў, абанкроціўся ўрад)—
Яе самазваная слава
На блізкі ідзе заняпад»...

Настаўнік у добрым гуморы,
Начальству ўсміхаецца ён,
Выносіць з далёкай каморы
На хату стары грамафон.
Ён рад, што начальства за чаем
Таксама ў гуморы...
— Для вас,
Дазвольце... пласцінку сыграем
«На сопках Манчжурыі»... вальс.
Чакаючы весткі з кардона,
З панамі дзяржавы чужой
Сядзіць гаспадар грамафона
Пад шэрай бляшанай трубой.
Сярод мястэчковае знаці
Ён жыў без сям'і, без радні —
І цяжка яму ўспамінаці
Пад песню юнацкія дні.
Хто быў ён?—настаўнік вясковы.
Што знаў ён?—урадніцкі бот.
Што помніць? — у вечар вясновы
Апошнія жончыны словы —
Памерла яна ад сухот.
На сопках Манчжурыі дзікай
Сном вечным спіць царскі салдат,
Чужынец радзімы вялікай —
Данілы Пятровіча брат.
І сам ён — салдат катаваны,
І чуў, як гарматы гулі,
Як глуха звінелі кайданы
Калоднікаў рускай зямлі.

Да школы з паўночным візітам
Старое начальства прышло,
Два цені — адбіткам забытым,
Тупым, задаволеным, сытым —
Кладуцца на сцены, на шкло.
Начальства мінулае ўчора
Дзяліла свае барышы,
Сівога шаўца, ці шахцёра
Душыла ў турэмнай цішы...
А сёння іх скончана слава.
Пад месяца ясным святлом
Трывожна: Застава... застава...
Гудуць правады за акном.
Над полем цярушыцца іней
З марозных дратоў уначы,
Па светлай савецкай краіне
Трывогу сваю несучы.
Замоўк грамафон. Пад санямі
Рыпяць палазы ў цішыні •
Давера Ігнат за гасцямі
Прыехаў з сяла на кані.
Халодны над школаю месяц —
Палярны вакол яго круг,
Па гэтай зімовай прыкмеце
Чакае народ завірух.
Па роўнаму, сіняму полю,
Дзе белыя ўзлессі відны,
Увайшоўшы ў патрэбную ролю—
Замежныя едуць чыны.
У санях шырокіх Даверы
На сене з арцельных лугоў
Задумаўся чын аб кар'еры,
Вось ён... падпісвае паперы
Адказных службовых сталоў.
Чын выб'ецца ў людзі... і нізкі
Адважыць паклон яму Русь, —
Так думае Вінцусь Даўбніцкі —
Інструктар Сафонаў Пятрусь.
Пад месяца ўсмешкаю яснай,
Сафонаў-Даўбніцкі ў зіму
Вязе для жывёлы калгаснай
У чорным партфелі чуму,
Падскокваюць лёгкія сані,
У іх з катам саймуецца кат,
Вязе самазванцаў Сусанін —
Таварыш Давера Ігнат.
Тры коннікі напагатове
На ўзлессі чакаюць, стаяць,
Пад сінім святлом у дуброве
Спакойна клінкі зіхацяць.
. . . .
А ну, ці не час вам, панове,
З шырокіх саней вылязаць!
Галовы ўбіраючы ў плечы,
Пад ціхай пагрозай ляза,
Байцам аддаюць свае рэчы
«Інструктар Райфа і Райза».
На сёмай вярсце ад граніцы
Канчаецца іхні паход,
Саміх іх бярэ ў рукавіцы
У ежовыя рускі народ.

А. Бялевіч

КАМДЫЎ КАЗАЧАИ

I.

Час трывожны, час гарачы,
Неспакойны час, —
Гарачоў, камдыў казачай,
Атрымаў наказ:
— Разграміць шакалаў зграю,
Лютых крумкачоў.
Вам, таварыш, даручаю, —
Воін Гарачоў.
Разграміць дашчэнту банду,
Загадаў сам Клім.
Гарачоў даваў каманду
Коннікам сваім:
— Бяры саблі, бяры пікі,
Сабірайся ў шлях.
Каты зверам, лютым, дзікім
Шныраць па палях.
Змеем чорным, падкалодным,
Подлыя, шыпяць,
І руйнуюць скарб народны;
Гарады гараць.
Паляць вёскі, паляць нівы
Подлаю рукой.
На бандытаў! За радзіму!
Воіны, за мной!

II.

Па дарозе цокалі
Коні ўперабой,
Мчаўся быстрым сокалам
Гарачоў у бой.
Па дарозе пыльнай,
Па траве густой,
За Кубань кавыльную!
У рашучы бой!
За маці — радзіму
Вольную сваю.
З пераможным гімнам,
З песняю ў страю!
Помніцца дубровам,
Не забудзе Дон,
Як ляцелі брава
Коннікі ўздагон.
На лютых бандытаў,
На варожы стан!
Конніцай разбіты
Белых атаман!
Зашумеў, запеніў
Многаводны Дон...
Казакі прапелі:
«Разлівайся, Дон».

III.

Час бурлівы, час гарачы
Вольнай працы час.
Гарачоў, камдыў казачай,
Выканаў наказ.
І ўздыхнулі вёскі, нівы,
Усё пайшло на лад.
Гарачоў, камдыў любімы, —
Слаўны дэпутат.
І калі памкнуцца банды,
Зграя крумкачоў:
Дасць загад байцам: «за мною!»
Воін Гарачоў.
«Па дарогах, па знаёмых»,
Па траве густой
Пойдзе зноў ён за Наркомам
У апошні бой.

Міхась Калачынскі

З М Е Н А

Блакітны вечар за вакном,
На шыбах кропелькі расы.
Спіць моцным бестурботным сном
Адважнага танкіста сын.

Што сніш ты, любы хлопчык мой?
Шукаеш дзе, якіх прыгод?
Ты мажа бачыш — бацька твой
Магутны танк вядзе на фронт?
Трывожныя такія сны
Уноч не будзяць хлапчука —
Вартуе бацька ад вайны
Спакой са зброяй у руках.
— Не сні трывог, мой галубок, —
Гаворыць маці ціха так, —
Прыедзе бацька, мой сынок,
Табе забаўны купіць танк.

І пры ўспаміне у пакой
Ступіў ён радасны да слёз.
Сустрэча.
— Дзе-ж любімец мой?
Вялікі, а ці дужы ўзрос?

А сын на ложку на сваім
Спіць бестурботна у цішы.
Садзіцца блізка перад ім
Чаканы бацька,—госць з мяжы.

Ад ветлай бацькавай рукі
Растаў, як дым, дзіцячы сон;
Хапае хлопчыка танкіст,
Цалуе сына моцна ён.

І хлопчык зорку дастае,
Што яркім свеціцца агнём,
Сабе, як воін, надзяе
Вялікі бацькаў цёплы шлём.

Спаўзае шлём той з галавы,
Кудлаціць хлопцу валасы...
— Расці, мой сынку, баявы!
Расці на змену, добры сын!

Анатоль Астрэйка

НЕ ШУМІ, ВЕЦЕР-ВОЛЬНІЦА...

Не шумі, вецер-вольніца,
Дрэваў ніц не схіляй,
Не хадзі за ваколіцай,
На палях не блукай.

Ты замуціш крынічаньку
У зялёным гаю.
Берагуць пагранічнікі
Там радзіму сваю.

За табой пойдуць шолахі,
Ляжа змрок на карчы,
Зграя злых, лютых ворагаў
К нам палезе ўначы.

Не збірай, вецер, сполахі,
Марна сілу не траць,
Нашых ніў лютым ворагам
Не таптаць, не таптаць.

Ні пахмураю восенню,
Ні ў страшэнны буран
Змеям — госцям няпрошаным
Нас не ўвесці у зман.

Знаем мы ля крынічанькі
Шолах траваў і хвой.
На мяжы пагранічнікі
Наш вартуюць спакой.

Не шумі за ваколіцай —
Там калгасаў палі,
Збажына нізка клоніцца
Буйным зернем к зямлі.

Жыта горда красуецца,
Вее пах медзвяны,
Ад вятроў-жа хвалюецца
Акіян аржаны.

Не ўздымай шуму-гоману,
Асцярожней ступай,
Спее ў полі над Нёманам
Наш багаты ўраджай.

Не шумі, вецер-вольніца,
Ніцма дрэў не схіляй,
Не хадзі за ваколіцай,
Чорны змрок не збірай.



Прывітанне Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і Совета Народных Камісараў СССР тав. Емельяну Яраслаўскаму

У дзень Вашага шасцідзесяцігоддзя Цэнтральны Камітэт ВКП(б) і Совет Народных Камісараў Саюза ССР шлюць Вам — старому большэвіку з гвардыі Леніна, адданаму работніку нашай партыі, актыўнаму барацьбіту за справу рабочага класа і сялянства — гарачае прывітанне.

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) і Совет Народных Камісараў Саюза ССР жадаюць вам многіх год плённай работы на карысць партыі і соцыялістычнай радзімы.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ВКП(б).
СОВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР.

Емельян Яраслаўскі

Старому большэвіку з ленінска-сталінскай гвардыі Емельяну Яраслаўскаму сёння 60 год. Сорак год яго жыцця прысвечаны няспыннай рэволюцыйнай рабоце. Партыя ведае тав. Яраслаўскага як нястомнага большэвіцкага прапагандыста і агітатара, які многія годы актыўна змагаўся за справу рабочага класа і сялянства.

Емельян Яраслаўскі нарадзіўся 19 лютага 1878 года ў Чыце, у сям'і селяніна з ссыльна-пасяленцаў. Першыя крокі яго рэволюцыйнай работы звязаны з Забайкаллем: тут ён у 1898 годзе арганізаваў першы гурток рабочых-чыгуначнікаў, які неўзабаве вырас у «Саюз рабочых Забайкалля».

У 1905 годзе Емельян Яраслаўскі правёў вялікую прапагандысцкую і агітацыйную работу ў рабочых кварталах Пецербурга.

Праследуемы пасля крывавай нядзелі паліцыяй, тав. Яраслаўскі выязджае ў Одэсу, дзе яго арыштоўваюць. Пасля дзесяцідзённай галадоўкі ён вызваляецца з турмы пад нагляд паліцыі. На другі-ж дзень ён зноў на большэвіцкім падпольным пасту. Пад імем Сцяпана Красільнікава ён вядзе вялікую агітацыйную работу ў масах, асабліва ў дні гераічнага паўстання на броненосцы «Потемкин».

Тав. Яраслаўскі — ўдзельнік Тамерфорскай партыйнай канферэнцыі 1905 года, IV і V з'ездаў партыі.

Адразу-ж пасля звароту з Лонданскага з'езда ён быў арыштаван у Пецербургу царскімі жандарамі і ў чаканні суда правёў паўтара года ў «Крэстах» (Пецербургская адзіночная турма). Ваенным судом быў прыгаворан да катаргі. Па сканчэнні пяцігадовай катаргі быў сасланы ў Якуцк, дзе і прабыў да лета 1917 года.

Тав. Яраслаўскі—актыўнейшы ўдзельнік Кастрычніцкага перавароту. Ён прымаў удзел у стварэнні Чырвонай гвардыі. У 1918-19 гг. быў ваенным камісарам Маскоўскай ваеннай акругі. У 1920 годзе працаваў у Сібюро ЦК РКП(б) і ў Омскім камітэце партыі. У 1921 годзе быў сакратаром ЦК РКП(б).

З 1923 года тав. Яраслаўскі—сакратар рэарганізаванай па плану Леніна ЦКК. І тут ён праяўляе сябе, як паслядоўны і непрымірымы барацьбіт за чыстату і маналітнасць партыйных радоў, бязлітасна выкрываючы двурушнікаў і апартуністаў усіх масцей. На XVII партыйным з'ездзе тав. Яраслаўскі выбіраецца членам Камісіі Партыйнага Кантролю пры ЦК ВКП(б).

Тав. Яраслаўскі — дэпутат Вярхоўнага Совета СССР.

Ів. Шапавалаў

НАЧАЛЬНІК Н-СКАЙ ЗАСТАВЫ

Да вакна прыціснулася густая цемра лістападаўскай ночы.

Начальнік заставы Сцяпан Церахаў скончыў чыстку маўзера і, уклаўшы яго ў драўляную кабуру, прайшоўся па пакою. У насцярожанай цішыні кардона, падкрэсленай ціканнем гадзінніка і выццём ветра, крокі прагучалі рэзка, неяк выклікаюча. Церахаў прыпыніўся каля вакна. За чорным шклом падвойных рам сумна церушыў надакучлівы бесперапынны лістападаўскі дождж. Дробныя кропелькі прыліпалі да знадворнага шкла і застывалі. Толькі дзве-тры больш буйныя кроплі прабіваліся паміж імі, ўніз па шклу. У іх цьмяна адлюстроўвалася святло лямпы, якая стаяла на стале.

Начальнік заставы зірнуў на гадзіннік: дзесяць хвілін чацвертай. Пара. Ён пачаў апранацца. У дзверы пастукалі.

— Уваходзьце.

Увайшоў дзяжурны.

— Таварыш начальнік, праваднік Власенка гатовы.

— Іду. Застанецца памочнік. Будзе званіць камендант, — перадайце: пайшоў на ўчастак.

Патушыўшы лямпу, начальнік заставы разам з дзяжурным выйшаў з пакоя.

У калідоры, цьмяна асветленым «лятучай мышшу», іх чакаў ужо апрануты ў шынель і плашч высокі шыракаплечы пагранічнік. На яго свежа вымытым твары яшчэ не паспелі знікнуць сляды толькі-што перапыненага салодкага сну. Баец трымаў за ашэйнік сабаку. Сабака жмурыўся на святло ліхтара, прыціснуўшы воўчыя вушы і нервова памахваючы хвастом.

— Добры вечар, Власенка.

— Добры вечар, таварыш начальнік.

— Ну... пайшлі.

— Двое і сабака выйшлі на ганак.

Вецер быццам узрадваўся, шпурнуў у твары пагранічнікаў вадзяністы пыл, ірвануў полы брэзентавых плашчоў і матлянуў імі аб высокія халявы балотных ботаў.

Нічога не відаць. Асабліва са святла. Каля варот з цемры ўзнікнуў чорны сілуэт, твару не пазнаць.

— Таварыш начальнік, за час нясення службы ўсё ў парадку, — напоўголаса паведаміў вартавы кардона.

— Вядзіце далей назіранні, таварыш Сілін, — ціха адказаў начальнік заставы, і разам з правадніком яны выйшлі за вароты.

— На правы фланг, Власенка.

...Вецер жалобна выў у тэлефонных правадах.

Яны праверылі вартавых і павярнулі ўжо назад, калі скрозь шум голых дрэваў і свіст ветру да іх даляцеў глухі гук стрэлу здалёк, з другога фланга.

Яшчэ... Зноў.

Да нізка навіснуўшых калматых чорных хмар узнялася ракета. Яе святло, размытае дажджом, здалося цьмяным і мутным.

— Эх... ты! Напэўна на левым флангу заварушка? — Церахаў прыпыніўся, прыслухоўваючыся. Власенка таксама. Зноў глуха ахнула некалькі стрэлаў.

— Націснем, Власенка. — Пагранічнікі паскорылі крок. Граніца прытаілася. Ноч стала быццам яшчэ чарнейшай.

Вецер і дождж. Да кардона яшчэ некалькі кілометраў...

...Сабака рэзка ірвануўся ў бок. Власенка насцеражыўся.

— Ты што, «Амур»?—сабака нацягваў павадок, зацягваў праваднік ў тыл.

— Таварыш начальнік! — Церахаў ужо быў побач. У яго руцэ загарэўся ліхтарык. Сноп святла прабіў цемру і ўпёрся ў мокрую, пакрытую рыжай травою і напоўзгніўшым лісцём зямлю. Замітусіўся па ёй. Сабака непакоіўся.

Ну, вядома, трава прымята. Напэўна след. Зусім свежы. Далей. Другі. Ліхтарык згас, быццам не вытрымаў барацьбы з ноччу.

Пагранічнікі на мінуту прыпыніліся. Начальнік заставы зірнуў на цыферблат гадзінніка — трыццаць пяць мінут шостага. Самы час.

— Суседзі мудрацць. Там шумяць, тут гасцей піхаюць. Пускай сабаку, Власенка... Далёка не адышоў.

Пагранічнікі кінуліся па следу.

Хутка бяжыць сабака. Вецер, халодны, калючы, разам з кроплямі дажджу кідае ў твар пушыстыя мяккія сняжынкі. Снег. Мутна-белая заслона паўстае перад вачыма.

Пачалася мяцеліца.

Ногі чапляюцца за карэнні дрэў. Намокнуўшыя плашчы замаруджваюць рух. Полы шынеляў блытаюцца ў нагах, перашкаджаюць ісці. Цяжка дыхаць.

Сабака скочыў і прыпыніўся, вінавата завіляўшы хвастом. Пагранічнікі прыпыніліся таксама.

Рэчка, чорт-бы яе пабраў. У гэтым месцы яна глыбокая, хоць і не шырокая. Начальнік заставы запаліў ліхтарык. На глеістым беразе зусім выразна прыкметны след бота. Церахаў моўчкі зняў плашч, шынель і калодку маузера. Пакінуўшы вопратку на беразе, пагранічнік скочыў да вады і высока ўзняў маузер ў левай руцэ, увайшоўшы ў чорную ваду. Паплыў. Власенка моўчкі следваў прыкладу начальніка. Ледзяная вада апякла цела. Здавалася яна прабралася ў нутро і была густой і калючай. «Амур» апошнім смела скочыў у раку, але калі пагранічнікі выходзілі на супроцьлеглы бераг, ён ўжо абтрасаў ваду з сваёй густой пушыстай шэрсці. Вопратка прыліпла да цела. У ботах непрыемна хлюпала. Пальцы дзеравянелі ад холаду.

— Вось цяпер дык ужо напэўна дагонім, — з усмешкай ціха прамовіў Церахаў, перамагаючы дрыжыкі. Сабака няўпэўнена павёў носам. След знікнуў.

— Пашукаем. Доўга ў такой вадзіцы не паплавае.

След ворага знайшлі метраў за пяцьдзесят уніз па цячэнню ракі. Пагоня аднавілася. Лес скончыўся. Сабака вывёў на прасёлак. Ноч праходзіла. Вецер ужо ачысціў усход ад хмар і там неба пачынала прасвятляцца. Улева ад дарогі чарнела закінутая смалярня. Сабака ірвануўся да яе.

— Спусціце сабаку.

Атрымаўшы свабоду, «Амур» апынуўся каля пракопчанай напоўразбуранай хацінкі. Праз секунду адтуль пачуліся адначасова выццё сабакі, гук стрэлу і чалавечы крык.

Пагранічнікі забыліся пра стому і холад.

— Клюнула, таварыш начальнік.

Церахаў, на-хаду зараджаючы маузер, падбягаў да хацінкі. Власенка ледзьве паспяваў за ім. Калі начальнік заставы ўскочыў у хацінку, у ёй на падлозе качаўся жывы клубок. «Амур» глуха вурчаў, усадзіўшы клыкі ў кісць правай рукі чалавека, які ў сваю чаргу, схапіўшы сабаку левай рукою, прабаваў зубамі дацягнуцца да яго шыі. Каля парога валяўся новенькі парабелум. Пхнуўшы маузер у кабуру, а пісталет парушальніка за пояс, Церахаў ірвануў левую руку ворага і, вызваліўшы сабаку, прыціснуў бандыта да падлогі. На яго ва ўпор з цемры пазіралі вочы ворага, поўныя нянавісці.

— Здаюся. Пусці, — прашыпеў ён скрыўленым ад болю і злосці ротам.

— А што-ж вам яшчэ застаецца рабіць? — начальнік заставы ўзняўся на ногі, накіраваўшы парабелум на ляжачага.—А ну, устаць! Абшукайце яго, Власенка.

Бандыт з цяжкасцю узняўся на ногі. Вобыск заняў некалькі хвілін.

— Ну, прашу. — Начальнік заставы паказаў бандыту на выхад.

— Не пайду. Нясіце, калі вам трэба.

«Амур»!...—Начальнік заставы спакойна паклікаў сабаку.

— ... Пайду сам. Забярыце толькі вашага шчанюка.—Бандыт са злосцю зірнуў на пагражальна апшчэраную лапу сабакі і накіраваўся да выхаду.

— Вы благаразумны, — усміхнуўся начальнік заставы.

Калі Церахаў і Власенка ўводзілі парушальніка ў двор заставы, было ўжо адзінаццаць гадзін раніцы. Вопратка на іх абледзянела. Твары былі сіне-шэрыя. Кожны рух выклікаў боль. Новы вартавы ля кардона, убачыўшы іх, на секунду прыпыніўся і замест звычайнага рапарта ў яго вырвалася:

— Вось гэта — так!..

Перадаўшы затрыманага дзяжурнаму і загадаўшы Власенку неадкладна распранупца і, напіўшыся чаю, легчы, Церахаў пайшоў да сябе на кватэру. Яна знаходзілася тут-жа, побач з кардонам, у невялікім доміку для начальніцкага складу. Калі ён увайшоў у пакой, Вара, жонка, была на кухні.

— Добры дзень, начальнік! — пачуўся адтуль яе мяккі, жартаўліва-ласкавы голас. — Загуляў ты ў мяне. Устала, снеданне прыгатавала — прыдзе, гарачага з'есць, думаю. Як-жа, чакай... — з гэтымі словамі яна з'явілася ў дзвярах... — Маці родная! Дзе табе так папала? — Яна ірванулася да чамадана, што стаяў у куце, адчыніла яго і выкінула адтуль першую трапіўшую пад руку пару бялізны. — Распранайся неадкладна-ж! Дзе гэта ты? Сцёпа!

— Нормы на плаванне здаваў, — Церахаў спрабаваў усміхнуцца пасінелымі ад холаду вуснамі.

Жанчына нахмурылася, потым таксама ўсміхнулася.

— Сцяпан, не жартуй, калі ласка. Яна і сама разумела недарэчнасць свайго запытання.

Мінут праз пяць Церахаў сядзеў за сталом у чыстай бялізне, у велізарным кажусе і, не адчуваючы, што апальваецца, піў гарачы чай. Ён саграваўся. Гэта асалода зразумела толькі таму, хто хоць-бы раз у жыцці замярзаў, не трацячы прытомнасці, не адчуваючы, як кроў у самым простым сэнсе пачынае застываць і сэрца адмаўляецца гнаць яе па жылах.

Вара паспешліва прышывала пятліцы да новай гімнасцёркі.

— Няўжо ніяк не мог ты без... без такога купання?—Яна ўсё яшчэ не магла супакоіцца.

— Ты, Вара, як... ты-ж дарослая. Не кажы глупства. Ну, што я мог зрабіць інакш? Што-б ты зрабіла на маім месцы?

— Я? Ну, я... таксама палезла-б у ваду, вядома. — Абодва засмяяліся добрым смехам. Жанчына, скончыўшы шыць, ціха падышла да мужа і пацалавала яго. Начальнік заставы затрымаў руку жонкі і моцна паціснуў яе. У дзверы пастукалі. Увайшоў дзяжурны.

— Таварыш начальнік, цяпер ваш час. Людзі сабраны для правядзення палітычных занятках.

— Я зараз-жа. — Церахаў устаў.

Яшчэ адчуваючы зябкасць ва ўсім целе, Церахаў выходзіў са сваёй кватэры. На ганку яго сустрэў калгаснік Сымон Куракевіч. Яго левая рука была абкручана кавалкам палатна, скрозь якое прасачвалася кроў.

— Начальнік, руку я сябе сякераю пасек. Да больніцы далёка, памаж ёдам, калі ласка. — Мужчына раскруціў палатно, пад ім была раскрытая сечаная рана.

— Ідзі, дзядзька Сымон, да жонкі.— Яна табе перавязку зробіць.

— Дзякую, начальнік.

Скончыўшы палітычныя заняткі, Церахаў пайшоў рабіць свой звычайны абход памяшканняў заставы. Рабіў ён яго, як правіла, раніцою, але сёння рас парадак быў парушаны «па незалежачых ад яго прычынах». Зайшоўшы на канюшню, Церахаў сустрэў там павозачнага заставы, пярвейшага гарманіста ўсяго атрада — Кананенку. Ён толькі-што прыехаў і цяпер засыпаў корм свайму гнедаму «Арлу». Убачыўшы начальніка, баец шырока ўсміхнуўся.

— Пісьмо вам прывёз, таварыш начальнік. Ад «чэкіста» (так уся застава клікала дзевяцігадовага бойкага хлопчыка, сына Церахава, які цяпер вучыўся ў горадзе). — Па почырку ведаю, — пагранічнік палез за пазуху і беражліва выняў канверт, падаўшы яго Церахаву.

— Я яшчэ, таварыш начальнік, — пагранічнік усміхнуўся яшчэ больш шырока, — баян для нашай заставы атрымаў. Сапраўдны баян, новы, добры!

Допыт і адпраўка затрыманага раніцой забралі шмат часу. Ужо цямнелася, калі, урваўшы мінутку, начальнік заставы вырашыў пайсці паабедаць. Вара чакала.

— Жонка! Пісьмо ад Вовы, — проста з парога заявіў Церахаў і гэтым папярэдзіў традыцыйны поўжартаўлівы дакор за спазненне.

«... Татачка і мамуся, я не дурэю і да нас прыязджалі артысты, а па чытанню я сёння атрымаў выдатна...»

...Чыталі яны, схіліўшыся над сталом, на якім стынуў боршч, разліты ў талеркі. Яны ўсміхаліся. Логіка дзіцячага пісьма была зразумела, а адзнака «выдатна» па чытанню радавала не менш, чым таго, хто яе атрымаў.

. . . .

Праглядаючы пасля абеда газету, Церахаў спыніўся на ТАСС'аўскім паведамленні аб адбіцці пагранічнікамі Далёкага Ўсхода чарговай правакацыйнай вылазкі япона-манчжур. Ён перачытаў заметку два разы і ў раздуме, скідаючы попел з цыгаркі, ціха сказаў:

— Малайцы хлопцы. Восем супроць узвода, — ён акуратна выразаў заметку ножыкам і схаваў яе ў папку, дзе ўжо хавалася не адна такая выразка

— Што ты знайшоў там? — запыталася жонка, ставячы пасуду ў тумбачку.

— Далёкаўсходнікі нашы жару даюць. Геройскія хлопцы.

— Таварыш начальнік, вас камендант тэрмінова да тэлефона патрабуе, — накіраваны дзяжурным пагранічнік адчыніў дзверы без стуку. Начальнік заставы хутка ўстаў і надзеў шынель.

— Вячэраць прыдзеш? — запыталася Вара.

— Не ведаю, жонка. Спакойнай ночы, на ўсякі выпадак.

МАСТАЦТВА НА ФРОНЦЕ

Драматычнае, музычнае, эстраднае мастацтва было абавязковым спадарожнікам Чырвонай Арміі ў годы грамадзянскай вайны, роўна як і кніга, роўна як і чырвонаармейская мастацкая самадзейнасць. Палітаддзелы Чырвонай Арміі побач з пытаннямі штодзённага палітычнага выхавання воіна-рэвалюцыянера клапаціліся і аб сістэматычным мастацкім выхаванні асабовага складу арміі.

Побач з фармаваннем баявых часцей Чырвонай Арміі фармаваліся і палявыя, гарнізонныя, армейскія, дывізійныя тэатральна-эстрадныя відовішчныя арганізацыі. Пад канец 1919 года палітаддзелы дывізій, за рэдкім выключэннем, мелі пры сабе трупы, тэатры, эстрадныя групы. Ішла дывізія ў вялікі паход — пры абозе II разраду ішлі і акторы. Баец у разгары баёў пазнаваў вялікую сілу мастацтва, актор станавіўся байцом.

Знадворна армейскі актор нічым не адрозніваўся ад масы байцоў. Актор у кожную мінуту мог зрабіцца байцом. Пад Кіевам адна з дывізій трапіла ў белапольскае абкружэнне. Для таго, каб вырвацца з кальца, былі пастаўлены пад зброю ўсе тылавыя ўстановы, акторы побач з байцамі змагаліся са зброяй у руках супроць ворага. Некалькі чалавек загінула ў баю. Пад Брэст-Літоўскам трапіўшыя ў палон з чырвонаармейцамі акторы былі расстраляны азвярэўшымі белапольскімі акупантамі.

Якім акторскім складам камплектаваліся армейскія тэатры? Сюды ішоў свядомы актор, актрыса — г. зн. лепшы, перадавы, рэвалюцыйны работнік арміі мастацтва. У радах ваенных артыстаў знаходзіліся і лепшыя акторы сталічных тэатраў.

Склад тагочаснай армейскай трупы налічваў да 40—50 чалавек. Палітаддзелы дывізій, брыгад мелі акрамя таго некалькі канцэртных брыгад у складзе ад 4 да 10—12 чалавек, з адпаведна падабранай праграмай. Літработнік падыва рыхтаваў для брыгад мантаж на злобадзённую актуальную тэму, фортэп'яна замяняў баян. Побач з класічным рэпертуарам, народнай песняй выконваўся рэвалюцыйны рэпертуар.

У 16 арміі, якая знаходзілася ў 1919—1920 гадах у цэнтральнай частцы БССР, з базай у гор. Магілеве, было два сталых тэатры. Тут найбольш старанна рыхтаваўся рэпертуар, абслугоўваліся вялікія гарнізоны, умацаваныя раёны, але і гэтыя тэатры, у выпадку патрэбы, прыстасоўваліся да гастрольных турнэ па фронту.

Больш рэдка ў сістэме армтэатраў сустракаліся оперныя калектывы.

Рэпертуар тэатраў, я маю на ўвазе ў першую чаргу драматычныя тэатры, быў вельмі разнастайны. У вялікай пашане быў Астроўскі. Брыгадныя і дывізійныя тэатры ставілі «Без віны вінаватыя», «Беднасць не порок», «На чужым піры пахмелле». Гэтыя п'есы ішлі на сцэне ў некалькі скарочаным выглядзе, у выніку адсутнасці, па тэхнічных прычынах, магчымасці паказу іх на сцэне цалкам. Рад армейскіх тэатраў ставіў «Беспасажніцу», «Ваўкі і авечкі» і т. д. Любімай п'есай армейскіх тэатраў была «На дне» М. Горкага. Ставіліся п'есы Чэхава. З рэвалюцыйнага рэпертуара кожны тэатр меў п'есы «Чырвоны генерал» «Асінае гняздо», «Яго вялікасць», «Прыгавор» і рад іншых. Зараз гэты рэпертуар стаў бібліяграфічнай рэдкасцю, таму цяжка нават прыгадаць аўтароў.

Ішла барацьба крывёю за рэвалюцыю, адбываліся вялікія справы і ствараліся перамогі. Тэатры Чырвонай Арміі жылі з байцамі адным жыццём. Кіпела ў калектывах плённая работа Тэатр станавіўся магутным сродкам класавага выхавання байцоў і камандзіраў.

Афіцыйна шэфства саюза работнікаў мастацтваў над Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй прынята лічыць з 1923 годе.

23 лютага 1938 года саюз работнікаў мастацтваў, сустракаючы XX год Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, адзначае 15 гадавіну свайго шэфства над РСЧА. Але фактычна і практычна гэта шэфства пачалося 23 лютага 1918 года, калі з'явіліся першыя часці, першыя атрады Чырвонай Арміі. Армія работнікаў мастацтваў з 1918 года звязана з непераможнай РСЧА і магутным Ваенна-Марскім Флотам сувязямі братняй дружбы. І нездарма, па ініцыятыве савецкай тэатральнай Масквы, увесь тэатральны СССР так горача адгукнуўся на масавае правядзенне тэатральных, музыкальна-мастацкіх мерапрыемстваў для РСЧА у дні вялікай гадавіны..

Работнікі мастацтваў, акторы, музыканты павінны памятаць, што калі заўтра грымне гром, то ў рады РСЧА павінны будуць уліцца лепшыя, праверанныя брыгады работнікаў мастацтваў, каб прадоўжыць у радах Чырвонай Арміі слаўныя традыцыі сваіх сабратоў у мінулым, якія так шмат зрабілі ў годы грамадзянскай вайны для геraічнай Чырвонай Арміі, для яе слаўных перамог.

В. МУРАТ.



«Грудзьмі на абарону Петраграда!»—плакат часоў барацьбы з бандамі Юдзеніча. Рэпрадукцыя Саюзфота.


«Узяцце Растова». Карціна мастака Грэкава. Рэпрадукцыя Саюзфота.

У ДНІ СЛАЎНАЙ ГАДАВІНЫ

(СПЕКТАКЛІ, КАНЦЭРТЫ, САМАДЗЕЙНАСЦЬ)

У ТЭАТРАХ

* **Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР** дае на працягу трох дзён — 23, 24 і 25 лютага — восем канцэртаў, у якіх прымае ўдзел увесь калектыў тэатра. Чатыры канцэрты тэатр дае 23 лютага ў клубе Н-скага палка і ў падшэфных часцях. 25 лютага калектыў тэатра выступае ў Доме Чырвонай Арміі. Тэатр падрыхтаваў спецыяльны рэпертуар, прысвечаны гадавіне Чырвонай Арміі.

* **Дзяржаўны драмтэатр БССР** арганізуе 23 і 24 лютага для часцей Менскага гарнізона два дзённых спектаклі: 23 лютага — «Вочная стаўка» і 24 лютага—«Неспакойная старасць». Канцэртныя брыгады тэатра выязджаюць у гэтыя дні ў падшэфныя часці.

* **Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР** арганізуе 24 лютага для курсантаў ваеннага вучылішча імя Калініна дзённы спектакль. Будзе паказана п'еса «У нашы дні». 26 лютага ў тэатры адбудзецца сустрэча яго работнікаў з байцамі і камандзірамі падшэфнай часці.

У ДОМЕ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

* 22 лютага ў Доме Чырвонай Арміі імя Варашылава адбудзецца ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае 20 гадавіне Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. 23 лютага ў Доме Чырвонай Арміі брыгада Цэнтральнага Дома Чырвонай Арміі дасць канцэрт. У складзе брыгады — лаўрэат усесаюзнага конкурса чытальнікаў Балашоў, спявачка Лук'янчэнка і іншыя.

Увечары 23 лютага ў Доме Чырвонай Арміі адбудзецца вечар Н-скай дывізіі. Выступіць джаз менскага Дома Чырвонай Арміі, які падрыхтаваў спецыяльны рэпертуар, прысвечаны гадавіне: «Тры разведчыкі», «Партызан Жэлезняк», «Полюшка-поле», «Развітальная комсамольская», «Песня аб луганскім слесары», «Бывайце здаровы» і інш.

24 лютага Дом Чырвонай Арміі наладжвае ранішнік для дзяцей камначскладу, на якім выступяць калектывы дзіцячай самадзейнасці. Увечары — вялікі канцэрт для кавалерыйскіх часцей.

У КІНОТЭАТРАХ

* У дні гадавіны кінотэатры Менска пакажуць лепшыя абаронныя фільмы: «**Чырвоная зорка**»—«Валачаеўскія дні», «**Пролетарый**» — «Граніца на замку», «**Інтэрнацыянал**»—«Навелы аб героях лётчыках», «**Спартак**»—«Чапаеў».

* У Бабруйску, Барысаве і Лепелі Белдзяржкіно арганізуе ў гэтыя дні кіно-фестывалі для часцей гарнізонаў. Байцам будуць паказаны «Балтыйцы», «Ленін у Кастрычніку» і іншыя фільмы.

У КАНСЕРВАТОРЫІ

* 23 і 24 лютага некалькі брыгад у складзе педагогаў і студэнтаў Кансерваторыі выедуць у падшэфныя часці і дадуць там рад канцэртаў. У складзе кожнай брыгады — 8—12 чалавек. У праграме канцэртаў — творы Моцарта, Вагнера, Шопена, Ліста, Гуно, Расіні, Бізэ, а таксама творы савецкіх кампазітараў—Дунаеўскага, Шэхтэра, Блантэра, Туранкова, Кампанейца, Дзержынскага, Залатарова і інш.

У РАБОЧЫХ КЛУБАХ

* 23 лютага ў **клубе імя Сталіна** — сямейны вечар рабочых і работніц скургалантарэйнай фабрыкі імя Куйбышэва сумесна з падшэфнай часцю. Пасля ўрачыстай часткі — канцэрт сіламі Дзяржфілармоніі. 24 лютага — сустрэча рабочых і работніц фабрыкі «Комунарка» з падшэфнай часцю. Пасля ўрачыстай часткі — канцэрт мастацкай самадзейнасці рабочых і чырвонаармейцаў.

* **У клубе будаўнікоў** 23 і 24 лютага — вечары, прысвечаныя гадавіне Чырвонай Арміі. 23-га—вечар будаўнікоў Менбуда, 24-га—вечар будаўнікоў Дома Чырвонай Арміі. Мастацкая самадзейнасць клуба падрыхтавала спецыяльны рэпертуар, прысвечаны гадавіне.

Кіно

ГРАНІЦА НА ЗАМКУ

У лясным гушчары—прасторны светлы дом. Тут жывуць мужныя, маладыя сыны радзімы, на якіх ускладзен самы пачэсны і ганаровы абавязак — ахоўваць спакой і непарушнасць савецкай граніцы. Напружаным баявым жыццём жыве застава імя Хахлова на заходнім рубяжы нашай краіны.

Ціха шумяць дрэвы, спяваюць птушкі. Спакойны летні дзень. Але не давяраюць гэтаму спакою пагранічнікі — яны пільна аглядаюць знаёмыя мясціны, пільна прыслухоўваюцца да кожнага шораху ў лесе.

У сакрэце двое — пагранічнік Краеў і навічок, які прышоў добраахвотнікам у атрад, Галавін. Краеў на практыцы вучыць маладога байца геpaічнаму майстэрству пагранічніка...

І хлапчукі на лясной палянцы разважаюць аб граніцы, іх захапляе жаданне быць добрымі памочнікамі пагранічнікаў.

У гэты час разведка адной з суседніх дзяржаў рыхтуе перакідку ў нашу краіну буйнага шпіёна-дыверсанта. Начальнік фашысцкай разведкі правярае веды свайго вышкаленага агента, уручае яму пашпарт савецкага шофера і дае апошнія настаўленні: «стаць актыўным савецкім чалавекам», а потым — «у паветра, усё ў паветра!..»

Савецкая разведка ведае аб планах ворага, і начальнік пагранічнай заставы атрымоўвае заданне ўзяць шпіёна жывым.

На заставе звычайныя дні. У вольны час — вясёлыя песні выконвае самадзейны аркестр. Музыка выклікае імпэтныя танцы. Толькі ўзмоцнены нарады на граніцы, ды ўначы байцы адпачываюць не распрануўшыся.

Банда дыверсантаў — збегшых заграніцу кулакоў — праводзіць фашысцкага шпіёна. Бандыты атрымалі загад: калі іх заўважаць савецкія пагранічнікі, уцякаць так, каб даць магчымасць астацца непрыкмечаным агенту разведкі.

Ноч. Хаваючыся ў цень, крадуцца на савецкую зямлю дыверсанты, курчацца, як гады, паўзуць...

Але іх прыкмячае наш нарад. На заставе —, трывога. Пагранічнікі схапілі дваіх у балоце. А дваім—фашысцкаму разведчыку і бандыту Доўбні ўдалося ў гэтую ноч выслізгнуць з рук пагранічнікаў. Іх схаваў у смалакурні кулак, які прыкідваўся нямым. Але пагранічнікі ведаюць каварныя планы дыверсантаў, і не схавацца на нашай зямлі фашысцкім бандытам. Паслядоўна і настойліва, не ведаючы стомы, вядуць пагоню нашы пагранічнікі. Як шалёны воўк, кідаецца ў розныя бакі фашысцкі разведчык. Але дарэмна. Ен абкружаны. Апошняя схватка—і кар'ера шпіёна-дыверсанта закончана; ён у руках дужых, мужных нашых пагранічнікаў. Схоплены і Доўбня. Дапамаглі затрымаць дыверсанта даярка калгаса, хлапчук-пастушок. Мужна і пільна ахоўваюць рубяжы радзімы слаўныя пагранічнікі, увесь наш народ. Наша граніца на замку.

«Граніца на замку»—захапляючы гледача фільм. Прастата і праўдзівасць — цудоўныя якасці фільма. Героі яго — увесь калектыў пагранічнікаў, байцы і камандзіры. Добра, шчыра і проста іграюць акторы. Яны стварылі праўдзівыя вобразы мужных сыноў нашай радзімы, герояў-пагранічнікаў.

Аўтары сцэнарыя М. Даўгаполаў, І. Бачэліс, рэжысёр В. Жураўлёў стварылі яркі, таленавіты твор. Гэты фільм, выпушчаны ў студыі «Саюздзетфільма», будзе карыстацца заслужана вялікім поспехам як у нашых юных гледачоў, так і ў дарослых. Савецкая кінематаграфія ўзбагацілася да слаўнага юбілею Чырвонай Арміі яшчэ адным добрым мастацкім абаронным фільмам, які праўдзіва паказвае геpaічнае жыццё нашай Чырвонай Арміі, будні герояў-пагранічнікаў.

Ю. ГЕРАСІМАЎ.

С. Б. БЕРНАРДАЎ

Не стала тав. **Бернардава** С. Б. Толькі 9—10 дзён назад тав. Бернардаў прымаў актыўны ўдзел у рабоце ўсебеларускай нарады дырэктараў і мастацкіх кіраўнікоў тэатраў, з уласцівай яму дасціпнасцю, рэзка, па-бальшавіцку ўскрываў недахопы ў рэпертуарнай дзейнасці Упраўлення па справах мастацтваў.

Тав. Бернардаў прайшоў цяжкі жыццёвы шлях. Нарадзіўся ён ў 1891 годзе ў сям'і бедняка-краўца. У 1897 годзе ў пошуках заработку сям'я Бернардава пераехала ў вёску Кашалёва, б. Рагачоўскага павета, але праз год была адтуль выселена, як не маючая «права жыхарства». Дванаццацігадовым хлопчыкам С. Бернардаў аддаецца ў вучні да краўцоў і на працягу шасці год пераходзіць ад аднаго краўца да другога, церпячы нястачу ў гаспадарчыкаў-«дабрадзеяў».

У 1909—1910 гадах тав. Бернардаў пачынае захапляцца сцэнай, музыкай. І толькі ваенная служба адрывае маладога Бернардава ад любімай справы. Аслабаніўшыся ў 1914 годзе ад ваеннай службы, тав. Бернардаў аж да 1917 года працуе акторам у трупах яўрэйскай драмы (Гузіка, Заслаўскага і інш.).

З Кастрычніцкіх дзён 1917 года тав Бернардаў прымае актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці краіны. Быў дэлегатам першага з'езда яўрэйскіх артыстаў і харыстаў Кіева, з 1918 па 1920 год—член праўлення і старшыня губернскага саюза работнікаў мастацтваў (Гомель), сакратар саюза ў Рагачове, удзельнік другога Усерасійскага з'езда работнікаў мастацтваў у 1921 годзе. З 1924 года на працягу трынаццаці год ён працуе на кіруючай рабоце ў Магілеве (дырэктар мастацкага прадпрыемства), потым пераязджае ў Менск, дзе працуе у якасці дырэктара Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета (у 1936 годзе). Але з прычыны хваробы ён зноў ад'язджае ў Магілеў, дзе да апошняга часу працуе дырэктарам Дзяржаўнага рускага тэатра БССР. У снежні 1937 года быў выбран членам прэзідыума ЦП саюза работнікаў мастацтваў.



Цяжкая хвароба (туберкулёз лёгкіх) адняла ў нас Бернардава. Да апошняга часу ён не пакідаў работы. Тав. Бернардаў быў членам самай рэвалюцыйнай, самай жыццёдзейнай партыі ў свеце, ён быў членам ленінска-сталінскай партыі, і яна, комуністычная партыя, натхняла Бернардава, давала яму сілы, энергію, веру ў тую справу, якой ён кіраваў. Аптымізм, бадзёрасць, актыўнасць — гэтыя бальшавіцкія рысы Бернардава, аднаго з старэйшых работнікаў мастацтваў, былі ў ім выхаваны партыяй бальшавікоў, членам якой ён быў каля дзесяці год. Тав. Бернардаў актыўна змагаўся з усімі скажэннямі на фронце мастацтва, з ворагамі, якія арудвалі на гэтым участку. Ен памёр на пасту, як верны часавы сваёй радзімы.

Бывай, друг і таварыш!

Група таварышоў.

ЛЕЙТЭНАНТ БРЫЧЫКАЎ

Запомніліся з маленства вялікія лугі ля рэчкі, куды ўсёй вёскай на сенажаць выязджалі. Крутыя берагі шматводнай Сожы. У памяці засталіся кароткія летнія ночы, ля кастра, на начлегу і ваколіца вёскі Струкачова, дзе праходзілі незлічоныя дзіцячыя гульні ў вайну. Завадатарам і канаводам быў ён сам. Толькі аднойчы здарылася непрыемнасць: «артылерыя», што страляла па яго «каардынатах», агнём з-за прыкрыцця хвядосавай лазні пабіла гаршчкі на паркане.

А калі было дзевяць год, — на ўсё жыццё ўрэзалася ў памяць карціна, як праходзілі праз вёску палкі Першай коннай, іграла музыка. Клубіўся пыл. На рэзвых конях сядзелі байцы з загарэлымі тварамі, авеяныя дымам баёў. Палымнелі чырвоныя сцягі. Лёгка рысіла артылерыя, якая з грукатам гармат пайшла ў галоп каля спуску за вёскай. Ен тады заплюшчыў вочы і ўявіў сябе байцом на кані, з сабляй і вінтоўкай, зацягваючым у страю «Калінушку».

Бегала гуртом дзятва ў суседнюю вёску, дзе быў прывал будзённаўцаў. Завяла знаёмства з байцамі. Ен доўга з захапленнем стаяў ля гармат, не хацелася вяртацца дахаты. Так-бы, здавалася, і застаўся тут — з байцамі, у паход-бы з імі пайшоў.

Уражанні маленства вялікія, моцныя і незабыўныя.

Раніцай конная Будзённага пайшла, пыл улёгся. А ў хлопчыка засталося непераможнае жаданне стаць байцом Чырвонай Арміі. А тут яшчэ на вёску пачалі вяртацца, як скончылася вайна, чырвонаармейцы, камандзіры, хто на адпачынак, хто зусім—па ўзросту. Расказаў пра Чырвоную Армію, пра вайну з белагвардзейцамі, з палякамі, з японцамі — не абрацца, часу — проста-такі не хапала, каб за вечар усе пасядзелкі аббегаць.

Час ішоў, а ў маладым, падрастаючым грамадзяніне краіны Советаў развівалася і мацнела жаданне быць камандзірам Чырвонай Арміі, а іменна—артылерыстам.

Але наступіў доўгачаканы 1932 год,—стукнуў, як гаворыцца, прызыўны ўзрост; да прызыву чарговага, праўда, яшчэ год з лішнім, але ўзросны мінімум для магчымасці службы ў РСЧА настаў. І Міхаіл Брычыкаў ужо ў радах РСЧА. Зараз нішто не магло затрымаць яго ўступіць добраахвотнікам у Чырвоную Армію. Пачалася служба ў кавалерыі — у дывізіі з коннаармейскімі традыцыямі і багатай геpaічнай гісторыяй, створанай пад валзіцельствам жалезнага наркома Кліманта Варашылава і слаўнага Сямёна Міхайлавіча Будзённага, у Будзённаўскім палку. Збылася мара, што нарадзілася ў даўным 20-м годзе ля паркана ў вёсцы Струкачова, пад песні і музыку конных калон.

У 1933 годзе — кавалерыйскае ваеннае вучылішча, конна-артылерыйскае аддзяленне. Вось калі мара становіцца явай. А ў 1936 годзе Міхаіл Максімавіч Брычыкаў, бліскуча скончыўшы ваеннае вучылішча, удастоены загадам народнага камісара абароны годнасці лейтэнанта, прымае вучэбны ўзвод конна-артылерыйскай часці.

***

У коннай артылерыі баявы дзень камандзіра пачынаецца рана. У 5.30 раніцы штодзённа кавалерыйская сігналка іграе пад'ём. Можна было-б яшчэ паспаць, але малады лейтэнант Брычыкаў жыве і працуе па цвёрдаму плану. У 6.00 ён на нагах. Трэба праверыць уборку і догляд за баявымі сябрамі — конямі разведчыкаў і сувязістаў. А ў 8.30 пачынаецца баявая вучоба. Палітзаняткі, язда, навучанне абыходжанню са складанымі тэхнічнымі прыладамі артылерыі. Яму даверан не адзін дзесятак маладых байцоў — курсантаў, яны праз год павінны стаць маладымі камандзірамі, а частка з іх пойдзе ў ваеннае вучылішча. Выразны і строгі ў сваім рабочым баявым графіку дзень падраздзялення лейтэнанта Брычыкава. Нельга губляць ні адной чвэрткі гадзіны. Крок за крокам перамагаецца ў вучобе складаная праграма баявой і ваенна-палітычнай падрыхтоўкі. А акрамя гэтага яшчэ і свае, камандзірскія заняткі. Выхоўваючы людзей, трэба рыхтавацца і расці самому.

У разліку конна-артылерыйскага дывізіёна сувязь і разведка павінны працаваць дакладней за гадзіннікавы механізм. Задачы коннай артылерыі ў баю — дзейнічаць імкліва і, зменьваючы на хуткіх алюрах пазіцыю, біць праціўніка так раптоўна для яго, каб ён апамятацца не паспеў. Смелымі, дзёрзкімі, настойлівымі, выдатнымі коннікамі, рубакамі і пераможцамі кона ўсіх перашкод павінны быць разведчыкі і сувязісты коннай артылерыі. Такімі іх выхоўвае лейтэнант Брычыкаў.

Вось імчыцца ўскач на магутных конях па перасечанай мясцовасці конная батарэя. А паперадзе, яшчэ шпарчэй, прыпаўшы да холак коней, імчацца разведчыкі, яны выбіраюць пазіцыі. Выбар — некалькі літаральна секунд. Не паспела батарэя стаць, сувязісты падаюць да яе провад. Яшчэ імгненне — і беглы агонь грыміць у полі. Але коні зноў ля гармат. Скачуць на другую пазіцыю разведчыкі, імчыцца батарэя. Спыніліся. І зноў агонь, агонь! Лейтэнант Брычыкаў любоўна глядзіць на сваіх выхаванцаў, якія дарагі яму, аб якіх ён клапоціцца. Ен з імі па-камандзірску строгі, патрабавальны і па-таварыску ўважлівы. А яны рады, што работа іх бліскучая, ганарацца сваімі дасягненнямі, ганарацца сваімі камандзірам. Ен сам конны спартсмен, і курсанты яго імкнуцца не адстаць. Гарачы конь, які перамагае перашкоды, войстры клінок, што са свістам сячэ лазу, любімы для ўсіх занятак.

У Брычыкава гэта ўжо другі выпуск. Ен ужо выхаваў цэлы ўзвод малодшых камандзіраў. Манохін, Несвіянаў, Нікіцін, які цяпер у яго ў памочніках. Усё падраздзяленне яго як па баявой і ваенна-палітычнай падрыхтоўцы, так і па ўтрыманню тэхнікі лепшае ў часці. Яго падраздзяленне амаль усё комсамольскае. Вучоба спалучаецца з высокай свядомасцю байцоў, з пагалоўным удзелам усяго асабовага складу ў грамадскай рабоце. Падраздзяленне — узор і прыклад ва ўсёй часці і па ім раўняюцца, спаборнічаючы, усе падраздзяленні конна-артылерыйскай часці. Камандаванне часці, партарганізацыя робяць усё для таго, каб шырэй, эфектней разгарнуць работу падраздзялення тав. Брычыкава і вывесці ўсе батарэі на такую-ж вышыню.

Скончыўся плённы дзень баявой падрыхтоўкі. Дагледжаныя коні стаяць у клапатліва прыбраных стайнях. У поўным парадку складзена тэхніка. Пасля адпачынку пачынаецца па-за школьная і грамадская работа. Сход комсамольцаў, грамадскіх арганізацый, мастацкая самадзейнасць байцоў і камскладу. Тут застрэльшчык і таварыш зноў лейтэнант Брычыкаў. Ен і кіраўнік хора і танцавальнага калектыва. Сіламі сваіх байцоў ён паставіў п'есу «Пагранічнікі», спектакль ішоў у часці 6 лютага. Ен і футбаліст — каманда, дзе ён капітанам, у гарнізоне ўзяла першынства. Ен і выключны лыжнік. А байцы яго не адстаюць, яны ва ўсім пераймаюць свайго лейтэнанта, яны хочуць стаць такімі, як ён.

Есць і свой, асабісты час. Трэба не адстаць і ад мастацкага самавыхавання. Прачытваецца шмат і сістэматычна. Толькі вось крыўдна на марудныя тэмпы «Нового мира» у выпуску раздзелаў «Ціхага Дона». Гэтымі днямі прачытан раман «Вайна і мір». У перамежку з мастацкай літаратурай чытаецца і вывучаецца Клаузевіц. Мольтке і другія класікі ваеннай справы. А яшчэ асабісты час ідзе на падрыхтоўку да палітзаняткаў, да партвучобы, да будучых экзаменаў у Ваенную акадэмію.

Кандыдат ВКП(б) Міхаіл Брычыкаў, выхаваны партыяй, комсамолам і Чырвонай Арміяй, нясе ў сабе тыя слаўныя традыцыі волевага, культурнага камандзіра, якія прывіты яму шасцігадовым прабываннем ў РСЧА. Ен робіць іх здабыткам выхоўваемых ім ларучаных яму людзей. Такія, як ён і выхаваныя ім людзі, і ёсць тая магутная сіла Чырвонай Арміі, якую нельга перамагчы.

***

Поўнач. Томік Талстога адкладзены ў бок. У кватэры тухне святло. Раніца. Яшчэ цёмна. Заспявала зноў, як і кожны дзень, кавалерыйская сігналка. Ад дома, дзе камандзірскія кватэры, па плацу хутка, упэўненай хадой, крочыць да свайго падраздзялення лейтэнант Брычыкаў; сёння з раніцы, па асабістаму плану, ён правярае майстэрства службы сувязі. Пайшоў снег. Водблескі ліхтара падаюць на яго стройную постаць, якая знікае за вуглом чырвонаармейскага інтэрната. А яшчэ крыху пазней, з песнямі, праз плац ідзе яго падраздзяленне, скончыўшы ўборку.

Пачынаецца новы баявы дзень артылерыстаў.

В. ГЛАЗЫРЫН.

Выпраўленне памылкі

У ліпені і жніўні 1937 года ў № 40, 41 і 42 газеты «Літаратура і Мастацтва» былі змешчаны артыкулы, якія кампраметавалі тт. Зіноўева (Зеновіна), Летаўта і Цэсарскага. Карэспандэнты газеты С. Нортман і А. Есакоў абвінавацілі вышэйпамянёных таварышаў на аснове неправераных матэрыялаў. Пры праверцы ўсе кампраметуючыя таварышаў Зеновіна, Летаўта і Цэсарскага матэрыялы аказаліся неадпавядаючымі сапраўднасці. У сувязі з гэтым на тав. Есакова накладзена адміністрацыйнае спагнанне.

Рэдакцыя просіць прабачэння ў чытачоў і таварышаў Зіноўева (Зеновіна), Летаўта і Цэсарскага за дапушчаныя памылкі.

ТЭАТРЫ—ЧЫРВОНААРМЕЙСКАМУ ГЛЕДАЧУ

ВІЦЕБСК.

Віцебскі гарадскі драматычны тэатр падрыхтаваў да свята Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота спецыяльны літаратурны мантаж. У мантажы—песні аб Чырвонай Арміі, народныя беларускія песні аб вялікім Сталіне, аб слаўным палкаводцу маршалу Варашылаве, урыўкі з лепшых твораў прозы і драматургіі — з аповесці «Хлеб» А. Талстога, з п'ес В. Вішнеўскага і інш.

У дні свята тэатр выедзе на граніцу і пакажа пагранічнікам спектакль «Агні маяка». У гэтыя дні таксама будзе праведзена творчая справаздача тэатра перад камандзірамі і чырвонаармейцамі гарнізона.

МАГІЛЕЎ.

У дні свята Дзяржаўны рускі тэатр БССР паказвае чырвонаармейскаму гледачу спектакль «Слава».

У клубах чырвонаармейскіх часцей тэатр паказвае ўрыўкі з п'ес «Вочная стаўка», «Слава». «Як гартавалася сталь», «Неспакойная старасць».

Акторы тэатра Орлоў, Обуховіч, Палякоў і інш. кіруюць гурткамі чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР выказвае глыбокі жаль з прычыны заўчаснай смерці дырэктара Дзяржаўнага рускага тэатра БССР, старэйшага работніка на фронце мастацтваў — Сямёна Бернардавіча БЕРНАРДАВА.

Друкарня «Звязды». «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая 68, Дом пісьменніка. Тэлефон сакратарыята 25-394, рэдактара 20-831. Уп. Галоўлітбела № 4202.